Варта ўсім, хто калісьці завёў альбо збіраецца завесці сабаку, перачытаць казку Экзюперы «Маленькі прынц». Перачытаць і ўразумець нарэшце, што «мы ў адказе за тых, каго прыручылі…». СТАР. 3

Я тады ледзь стаяў на нагах. Мой калега Ваня Пінігін стаў на калені перад камп'ютарам і маліў яго, каб той запісаў фільм. Камп'ютар апошні раз уключыўся, запісаў усё і памёр канчаткова. СТАР. 5

Сёння адзначае свой «дзень народзінаў» такі нелюбімы дыетолагамі ўсяго свету, затое ўшанаваны многімі людзьмі прадукт — чыпсы. Прычым споўнілася хрусткім бульбяным лустачкам не абы-колькі, а 160 гадоў! СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЖНІЎНЯ 2013 г. СУБОТА № 158 (27523) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

УДЗЕЛЬНІКАМ XI РЭСПУБЛІКАНСКАГА ЭКАЛАГІЧНАГА ФОРУМУ

Паважаныя сябры!

Сардэчна рады вітаць удзельнікаў і гасцей фінальных мерапрыемстваў XI Рэспубліканскага экалагічнага форуму.

Ваш форум — гэта важная грамадская акцыя, якая мае высокі аўтарытэт і аказвае значны ўплыў на фарміраванне экалагічнай культуры беларусаў, выхаванне ў падрастаючага пакалення беражлівага стаўлення да сваёй зямлі.

Праводзімыя мерапрыемствы нязменна прыцягваюць у рады рэспубліканскага эколага-асветнага руху мноства новых прыхільнікаў, неабыякавых да сучаснага і будучага Айчыны.

Гэты форум праходзіць у Год экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя, аб'яўлены на ўсёй прасторы СНД. Няхай ён паслужыць аб'яднанню намаганняў спецыялістаў і грамадскасці ў справе аховы прыродных багаццяў, распаўсюджвання перадавых ідэй, навуковых распрацовак і тэхналогій, якія дапамогуць зберагчы і прымножыць прыгажосць нашай планеты.

Жадаю арганізатарам, удзельнікам і гасцям форуму моцнага здароўя, плённай работы, поспехаў, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

СВЯТКАВАННЕ ЮБІЛЕЮ ПЕРАМОГІ Ў КУРСКАЙ БІТВЕ ЎМАЦУЕ ГЛЫБОКІЯ ТРАДЫЦЫІ ДРУЖБЫ БЕЛАРУСАЎ І РАСІЯН

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне губернатару Курскай вобласці Аляксандру Міхайлаву ў сувязі з 70-й гадавінай перамогі ў Курскай бітве, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што святкаванне гэтага юбілею ўмацуе глыбокія традыцыі дружбы і ўзаемаразумення беларусаў і расіян, паслужыць яркім прыкладам доблесці, гонару і любові да Айчыны.

У АДНОСІНАХ З КУБАЙ НЯМА НІЯКІХ СУПЯРЭЧНАСЦЯЎ

Такую думку выказаў учора старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль Рубінаў на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Альфрэда Ньевес Партуонда, які завяршае сваю місію ў нашай краіне.

«Куба была для нас сябрам яшчэ з савецкіх часоў. Яна была і застаецца сімвалам імкнення да свабоды, нягледзячы ні на якія перашкоды. І адносіны з вамі ў нас заўсёды былі добрыя, — сказаў Анатоль Рубінаў. — У нас няма ніякіх супярэчнасцяў. Летась беларуская дэлегацыя на чале з Прэзідэнтам наведвала Востраў Свабоды, і шмат аб чым было дамоўлена». Дарэчы, за тры гады практычна мізэрны таваразварот, які ў нас быў з Кубай, вырас у некалькі разоў — з 7,4 млн долараў у 2010 годзе да 102 млн летась. «У многім гэта ваша заслуга, спадар пасол. Хацелася б, зразумела, і болей, але важна, што дынаміка назіраецца», — адзначыў кіраўнік верхняй палаты парламента.

У сваю чаргу, спадар Альфрэда Ньевес Партуонда заявіў, што «нягледзячы на тое, што з'язджае на радзіму, прыйшоў гаварыць аб будучыні». Ад імя Нацыянальнай асамблеі народнай улады Кубы пасол запрасіў нашых парламентарыяў наведаць яго родную краіну.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

КРЫНІЦА ДАЎГАЛЕЦЦЯ

— Наша крыніца ў рэкламе патрэбы не мае. Хто п'е гэтую ваду — здаровы і доўга жыве, — кажа вясковы староста і дэпутат сельсавета Марыя Мікалаеўна Кмец.— Нездарма век жыцця большасці тумінцаў сягае пад 90 і болей гадоў.

У памежнай зоне Брэстчыны тумінская крыніца — сапраўдная святыня і славутасць. Гэтак лічаць не толькі жыхары вёскі Тумін. Крыніц у акрузе наогул нямала (дарэчы, пра адну з іх — у вёсцы Вярхі, мы раней паведамлялі). Сюды ж, амаль каля самай мяжы з Польшчай, едуць з іншых вёсак, аграгарадкоў і пасёлка Высокае. А што ўжо казаць пра сваіх жыхароў, якія ідуць з бітонамі і вёдрамі з усіх бакоў... Хоць вёска вадой не абдзелена: у ёй прысядзібных 26 студняў.

Марыя Мікалаеўна даўно на пенсіі, але лічыць сваім абавязкам падтрымліваць парадак каля крынічкі. Амаль штораніцы яе можна заспець з мяцёлкай альбо граблямі ў руках.

— А ведаеце, чаму наша крыніца гэткая добрая? — перапытвае захавальніца, абапершыся на свой незаменны рыштунак, — бо настоена на блакітнай гліне. Яшчэ ў мінулую вайну параненым вайскоўцам прыкладалі гэтую гліну да ран, каб хутчэй загойваліся. У каго спіна баліць — добра акунуцца ў купелі. Калі ж праблемы са страўнікам — карысна ваду папіць да пачатку ежы.

Цяпер штогод у Туміне адбываецца асвячэнне вады — 9 жніўня, у дзень святога Панцеляймона (паводле праваслаўнай традыцыі). Пасля рэканструкцыі і ўпарадкавання тэрыторыі (студня аздоблена каменнем і накрыта дахам, схавана за агароджаю купель) наведвальнікі пачалі больш паважна ставіцца як да ўсяго крынічнага комплексу, гэтак і да самой вады. Сталі больш верыць у яе гаючыя якасці.

— Упарадкаванне крыніцы зроблена ўдзельнікамі брэсцкай моладзевай патрыятычнай суполкі «Покліч». Акрамя нашай, яны аздобілі яшчэ некалькі іншых крыніц: у Агародніках, у Ставах, Вярхах, — з удзячнасцю прыгадала Марыя Кмец. — Мы заўсёды молімся за іх, дай Бог ім здароўя!

Марыя Мікалаеўна прыгадала даўні выпадак, калі адзін святар, паспытаўшы вады, сказаў ёй: «Захоўвайце крыніцу — гэта святое месца!»

— Вось мы і захоўваем, — кажа стараста і спяшаецца дамесці апалае за ноч лісце. — Хутка прыедуць першыя паломнікі, трэба сустрэць іх чысцінёй і парадкам.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Камянецкі раён.

ЦЫТАТА ДНЯ

Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Пётр ПРАКАПОВІЧ:

«Прыватны бізнес Беларусі ў наступнай пяцігодцы павінен вырабляць 50% валавога ўнутранага прадукту. Мы ідзём у гэтым напрамку, роля малога і сярэдняга бізнесу ў перспектыве будзе толькі павышацца, прыватны сектар павінен быць піянерам пры ўкараненні новых тэхналогій, сучасных метадаў кіравання. Разам з тым гэта не азначае, што будуць скарачацца іншыя формы ўласнасці. Буйныя дзяржаўныя прамысловыя прадпрыемствы таксама будуць развівацца хуткімі тэмпамі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2013 г.

Долар ЗША	8930,00	■
Еўра	11910,00	▼
Рас. руб.	270,00	■
Укр. грыўня	1098,63	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 20°
Віцебск	+ 14°
Гомель	+ 17°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 14°
Мінск	+ 16°

Курсавая розніца: што будзе далей?

Удзельнікі сусветнага валютнага рынку апошнімі днямі проста засыналі на таргах.

Дачакацца хаця б якіх-небудзь нагод для выгаднага зруху курсу не змаглі. А таму псіхалагічная напружанасць, якая праглядалася яшчэ на мінулым тыдні, засталася і нават вырасла: што ж будзе далей?

Непакоіць пытанне аб тым, ці зробіць Еўропа альбо ЗША якінебудзь рашучы крок, замест паступовага выраўноўвання сітуацыі, што (на мой погляд) будзе лепшым для эканомік, але горшым для валютных гульцоў.

Курс беларускага рубля гэтымі днямі таксама амаль стаяў на месцы. «Валютны бум», відаць, і сапраўды прайшоў. Долар за тыдзень падаражэў на 10 рублёў (плюс 0,1%) да 8930. Еўра і расійскі рубель, хаця і вагаліся, у выніку засталіся на ранейшым узроўні — 11910 і 270 рублёў адпаведна.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Урад гарантуе насельніцтву кампенсацыю страт у сувязі з забоем свіней з-за АЧС

Аб гэтым заявіў па выніках нарады ў Прэзідэнта віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Што датычыцца кампенсацыі людзям, то ўсё будзе выплачана. Я як кіраўнік штаба ставіў задачу: на працягу двух тыдняў з дня адабрання або продажу свіней павінен быць праведзены разлік з чалавекам», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Паводле яго слоў, аплата праводзіцца па цане большай за Br18 тыс. за кілаграм жывой вагі, насельніцтву поўнасцю кампенсуюцца ўсе затраты. Міхаіл Русы расказаў, што ў буферных зонах насельніцтва мае права або самастойна забіваць здаровую жывёлу і ўжываць у ежу, або пры жаданні аддаваць па закупачных цэнах на мясакамбінаты.

Як адзначыў віцэ-прэм'ер, у насельніцтва ўзнікалі пытанні з кампенсацыяй па нетэхналагічнай групе, гэта значыць тых катэгорыях жывёл, якія мясакамбінаты не перапрацоўваюць. Міхаіл Русы падкрэсліў, што ў аблвыканкамах знойдзена рашэнне гэтай праблемы. «Дапусцім, што датычыцца свіней вагой ніжэйшай за 30 кг, то насельніцтву выплачваюць ад Br600 тыс. да Br1 млн за галаву, і гэта дастатковая сума, каб кампенсаваць затраты чалавеку», — сказаў ён.

У той жа час Міхаіл Русы прызнаў, што месцамі «ёсць тапорная работа, калі недзе не растлумачылі, а ўрываліся».

Віцэ-прэм'ер у сваю чаргу папрасіў у насельніцтва, каб людзі таксама з разуменнем ставіліся да сітуацыі і ў тых рэгіёнах, дзе гэта неабходна, прымалі меры па недапушчэнні распаўсюджвання АЧС, выконвалі ўсе санітарныя нормы на падворках.

Урад Беларусі па даручэнні Прэзідэнта на працягу тыдня мае намер распрацаваць шэраг мерапрыемстваў, якія дадуць магчымасць насельніцтву, вымушанаму пазбавіцца ад свіней у сувязі з АЧС, у льготным парадку набываць іншую жывёлу.

«Ці гэта будзе буйная рагатая жывёла, ці авечкі, ці гусі, ці качкі — мы прапрацуем усе пытанні і ў цэнавых адносінах, і ў плане кармоў, пастаўкі камбікорму, калі чалавек хоча мець дадатковыя крыніцы паступленняў у свой бюджэт», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Міхаіл Русы лічыць, што і для невялікіх свінагадоўчых комплексаў у выпадку, калі няма неабходнай біялагічнай абароны, больш эфектыўна правесці пераспецыялізацыю, перайсці на вырошчванне іншага, эканамічна выгаднага віду жывёл.

Прафесар Эльжбета СМУЛКОВА:

«ТАЛЕРАНТНАСЦЬ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ АБЫЯКАВАСЦЬ»

Гэтую жанчыну ў Беларусі добра ведаюць: першы пасол Рэспублікі Польшча ў нашай краіне пасля набыцця ёю незалежнасці ў 1991 годзе. У нейкім сэнсе рамантыка таго часу была звязана з роднай мовай. А гэта і заклікала да дыпламатычнай работы такіх асоб, як спадарыня Смулкова: яна, мовавед, магла паспрыяць лепшаму паразуменню польскай і беларускай краін. І яна гэта зрабіла. Але пакінула дыпламатыю дзеля таго, каб займацца любімай справай — даследаваць мову і культуру ў тым ліку і нашага народа. У нейкім сэнсе гэта таксама дыпламатыя: спрыяе лепшаму разуменню і, адпаведна, паразуменню.

Адметна тое, што прафесар з Польшчы Эльжбета Смулкова вывучае асаблівасці гаворак памежных тэрыторый. Тых тэрыторый, якія найлепш ілюструюць кантакты паміж людзьмі, народамі. Гэтыя кантакты адпаведна адбіваюцца на мовах. З іншага боку, наадварот, па гаворках можна меркаваць, што адбываецца з людзьмі, як мяняюцца іх характары і светаадчуванне. Пра гэта і пайшла наша размова. СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБАРОНЦЫ ЖЫВЁЛ ПАПРАСІЛІ УЕФА ЗАБАРАНІЦЬ АХВЯРАПРЫНАШЭННІ НА СТАДЫЁНАХ

Некамерцыйная арганізацыя «Людзі за этычнае абыходжанне з жывёламі» (PETA) звярнулася да прэзідэнта УЕФА Мішэля Плаціні з просьбай забараніць рытуальнае забойства жывёл на стадыёнах у Еўропе. Зварот прыйшоў услед за ахвярапрынашэннем на стадыёне ў Казахстане перад матчам раўнда плэй-оф Лігі чэмпіёнаў паміж «Шахцёрам» з Караганды і шатландскім «Сэлтыкам». На казахстанкім стадыёне «Астана-Арэна» прынеслі ў ахвяру барана на трэніроўцы «Шахцёра». Для правядзення абраду ахвярапрынашэння на стадыён запрасілі мулу з мячэці. PETA нагадала Плаціні, што ён сам казаў пра абавязак УЕФА абараняць гульню, гульцоў і каштоўнасці футбола. Намеснік дырэктара PETA Мімі Бякхэчы адзначыла, што ахвярапрынашэнню няма месца ў сучасным грамадстве. Бякхэчы выказала надзею, што «прыгожая гульня не будзе ў далейшым заплямлена крывёй жывёл».

ПАМЁР ЮРЫСТ, ЯКІ АДСУДЗІЎ У ТЫТУНЁВЫХ КАМПАНІЙ 246 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ



Адвакат Рональд Мотлі, вядомы, сярод іншага, сваімі маштабнымі іскамі да тытунёвых кампаній, памёр ва ўзросце 68 гадоў. Пра гэта паведамляецца на сайце заснаванай ім юрыдычнай фірмы Motley Rice. Па словах другога заснавальніка фірмы Джо Райса, прычынай смерці адваката сталі ўскладненні, выкліканыя шматгадовай хваробай.

У біяграфіі Мотлі адзначаецца, што адвакат дамогся самай вялікай у гісторыі ЗША кампенсацыі з боку тытунёвых кампаній. У канцы 1990-х у выніку разглядаў вытворцы цыгарэт пагадзіліся выплаціць 246 мільярдаў долараў ахвярам тытунекурэння. Ганарар адваката, як пісалі тады газеты, склаў мінімум мільярд долараў. Для Мотлі барацьба з тытунёвымі кампаніямі была шмат у чым асабістай: яго маці была курцом і памерла ад раку лёгкіх. Ён вядомы і як вядучы адвакат, які бараніў інтарэсы больш за 6500 сваякоў ахвяр тэрактаў 11 верасня 2001 года ў іску, пададзеным да «Аль-Каеды».

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У ЛІВАНСКІМ ТРЫПАЛІ ПАДАРВАЛІ СУНІЦКІЯ МЯЧЭЦІ

Як мінімум 19 чалавек загінулі, яшчэ 35 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці ў выніку падвойнага тэракту, ажыццёўленага ў суніцкіх мячэцях у горадзе Трыпалі на поўначы Лівана. Па папярэдняй інфармацыі, колькасць забітых — 18 чалавек, параненых — больш за 60. Першы выбух адбыўся ў мячэці, імам якой з'яўляецца ўмераным сунітам, якія цвёрда крытыкуюць прэзідэнта Сірыі Башара Асада. Другая бомба разарвалася ў мячэці, дзе звычайна збіраюцца мясцовыя салафіты, якія таксама выступаюць супраць Асада. У Трыпалі, другім па велічыні горадзе Лівана, з пачатку сірыйскай грамадзянскай вайны рэзка абвастрыліся супярэчнасці паміж суніцкай і алавіцкай абшчынамі. За апошнія два гады канфлікт некалькі разоў перарастаў у фазу ўзброенага супрацьстаяння, з-за чаго ў горад былі ўведзены ўрадавыя войскі, закліканыя не дапусціць маштабнага кровапраліцця.

КОРАТКА

Праверкі і маніторынг кандытарскай прадукцыі Roshen у Беларусі прадоўжацца да верасня. Інспектары дзяржнагляду ўдзяляюць пільную ўвагу паказчыкам якасці, бяспецы прадукцыі, яе маркіроўцы. Для выяўлення неадпаведнасці і атрымання дакладных вынікаў прымяняюцца як візуальныя спосабы кантролю, так і інструментальныя — шляхам адбору проб і правядзення выпрабаванняў.

Турыстычны форум з удзелам прадстаўнікоў Беларусі і Шры-Ланкі пройдзе 27 жніўня ў Мінску. На форуме адбудуцца прэзентацыі буйнейшых тураператараў і сетак атэляў Шры-Ланкі.

Літва часова не будзе спаганяць плату за дэзынфекцыю грузавога транспарту на граніцы ў сувязі з афрыканскай чумой свіней. Магчыма гэтыя расходы возьме на сябе Еўракамісія. Да прыняцця рашэння дэзынфекцыя колаў транспартных сродкаў і абутку пасажыраў на пагранічных прапускных пунктах будзе фінансавацца Дзяржаўнай харчова-ветэрынарнай службай.

Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Беларускую стаматалагічную асацыяцыю

■ Напярэдадні

УСЕ КОЛЕРЫ БЫХАВА

Кастрычніцкая плошча ў цэнтры Быхава ўсё яшчэ нагадвае вялікую будаўнічую пляцоўку. Шмат людзей і тэхнікі задзейнічана дзеля таго, каб 1 верасня дастойна прыняць у абноўленым Быхаве XX, юбілейны, Дзень беларускага пісьменства.

ЦЭНТР СВЯТА

Намеснік старшыні Быхаўскага райвыканкама Нэла Шунькіна стаіць каля ўвахода на мясцовы стадыён, паблізу ад раённага Цэнтра культуры.

— Гэта будзе асноўная пляцоўка, дзе пройдуць мерапрыемствы Дня пісьменства, — паказвае Нэла Уладзіміраўна. — Тут усталююць галоўную сцэнічную пляцоўку і партэр для гледачоў на 2,5 тысячы чалавек, непасрэдна на зялёным полі стадыёна. Паблізу размесцяцца падворкі гарадоў-сталіц Дня пісьменства, а таксама павільён сродкаў масавай інфармацыі, дзе адбудзецца фестываль прэсы і кнігі.

На бакавінах двух жылых дамоў, якія выходзяць на Кастрычніцкую плошчу, зроблены стыльныя малюнкі з выявамі ўладароў Быхаўскага замка: Яна Караля Хадкевіча і Льва Сапегі. Сучасныя быхаўчане глядзяць на гордыя постаці гістарычных дзеячаў.

На самой плошчы рабочыя робяць пастамент для галоўнай святочнай скульптуры, якая называецца «Баркалабаўскі летапіс». Гэта вялізная кніга са старажытнымі пісьмёнамі, на адной са старонак якой будзе знакаміты абраз Баркалабаўскай Божай Маці.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

На вуліцы Леніна наводзяць апошні лоск.

«ТАЛЕРАНТНАСЦЬ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ АБЫЯКАВАСЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Польска-беларускае памежжа тычыцца жыхароў дзвюх краін. Ёсць памежжа з польскага боку, а ёсць з беларускага. Жыццё на памежных тэрыторыях, напэўна, уплывае не толькі на мову, але і на характары людзей. Цікава, ці адчуваецца розніца ў людзях, што жывуць на памежжы ў залежнасці ад таго, грамадзянамі якой краіны яны з'яўляюцца?

— Рысай памежжа па-мойму з'яўляецца тое, што людзі, нават калі размаўляюць на сваіх мовах, скажам, адны па-польску, другія ўжываюць беларускую гаворку, то ў іх мову ўсё роўна пранікаюць элементы — словы і нават граматычныя формы, спосаб вымаўлення — з іншай мовы. І гэта з'яўляецца адначасова нейкім элементам, які іх, як людзей, адрознівае; але ў той жа час вялікая супольнасць, носьбітамі мовы якой яны з'яўляюцца фактычна, прыпадабняе да сябе. Так што нейкай вялікай розніцы не будзе. Але будзе розніца, якая выклікана знешнімі абставінамі, дзяржаўнымі ўмовамі. Напрыклад, на памежжы ў Польшчы беларускія гаворкі перапоўнены ўжо цяпер, нават у параўнанні з тымі ранейшымі часамі, калі я пачала гэтым займацца (а гэта амаль палова веку). Яны насычаны паланізмамі ў большай ступені, чым гэта назіраецца ў польскай мове тут, на Беларусі. У Беларусі, акрамя беларускай лексікі і структуры мовы, вялікую ролю пачынае адыгрываць руская. Факт, што ў гарадах больш гавораць па-руску, не можа не адбіцца і на сельскіх жыхарах. Фактычна гэтая розніца ёсць. У Літве больш выразна захавана польская мова, бо там з канца вайны і па сённяшні дзень ёсць польскія школы... Знешняя розніца адыгрывае ролю, але ёсць увесь час многа супольнага. Аб'ядноўвае таксама тое, што з аднаго і другога боку дзяржаўнай мяжы ёсць балтыйскі субстрат на памежжы, якое я даследую.

— Як на вашу думку, ці адрозніваюцца паміж сабой беларусы з Польшчы і беларусы з Беларусі — па характарах і стаўленні да сваёй роднай культуры?

— Гэта пытанне, хутчэй, да псіхолага, чым моваведа. Буду казаць пра сваё адчуванне, зыходзячы з уласнага вопыту, які не можа быць тыповым і які нельга абагульняць. У Беларусі я сустракаюся з беларусамі, якія мяне ўспрымаюць як польку, якая цікавіцца імі, якая іх старацца разумець. Мне лягчэй з вамі (з беларусамі з Беларусі) быць у кантакце, чым з беларусамі з Польшчы, бо яны маюць нейкі элемент канфлікту як меншасць супраць той большасці, з якой я зыходжу.

— Вы памятаеце час, калі пачыналі свае даследаванні ў Беларусі, — якое тады, гадоў 50 таму, было стаўленне людзей да беларускай мовы ў параўнанні з цяперашнім днём?

— Маё адчуванне залежыць ад асяроддзя, у якім я знаходжуся. Я пачынала сваю стажыроўку сярод моваведаў Акадэміі навук Беларусі. Мы тады паміж сабою толькі па-беларуску кантактавалі, а цяпер выкарыстоўваецца не толькі беларуская. Але заўсёды было так, што калі я на вуліцы, у краме ці ў транспарце нешта сказала па-беларуску, то гэта выклікала пэўнае здзіўленне. Нейкай вялікай розніцы я не бачу. Бачу адну розніцу: калі пасля распаду Савецкага Саюза рэспубліка стала самастойнай краінай, пачаўся працэс беларусізацыі, то больш людзей па-беларуску гаварыла. Мая праца ў якасці пасла давала магчымасць сустракацца з людзьмі ва ўладзе ці дыпламатамі, якія выступалі па-беларуску. Цяпер на з'ездзе славістаў усе афіцыйныя асобы гаварылі па-беларуску. Хацелася б, каб паказвалі прыклад і далей.

— А паводле стасункаў з простымі людзьмі што адчуваецца?

— Простыя людзі, якія жывуць на вёсцы і якія не ўспрымаюць мяне як чужога, будуць ужываць сваю гаворку. Яна таксама мае уплыў расійскі ці польскі, але гавораць людзі, галоўным чынам, па-свойму. У горадзе ўсё ж такі па-іншаму, у сувязі з тым, што заўсёды быў аванс або ў кірунку польскай мовы, або ў кірунку расейскай. Я памятаю такое здарэнне: сустрэла ў нейкай гасцініцы чужую жанчыну, якая там працавала. Напэўна, прыбіральшчыцай была. І яна гаварыла на класічнай трасянцы. У сувязі з гэтым я загаварыла з ёй па-беларуску, бо думала, што ёй так будзе лягчэй. І гэта яе пакрыўдзіла так, што яна наогул перастала са мною размаўляць...

— Беларускі характар — вельмі загадкавы, нават для нас саміх... І часам здаецца, што стан мовы ад гэтага характару таксама залежыць. Бо цяжка ўявіць, каб ад роднай мовы адмовіліся палякі, нашы суседзі з Украіны сваю мову адстойваюць. Вы родам з Львоўшчыны, ведаеце характары людзей — польскіх, украінскіх, беларускіх. Якая роля характару народа, менталітэту ў моўным пытанні?

— Я зыходжу з таго становішча, што чалавецтва амаль што цэлага свету аднолькавае. Ёсць элементы культурныя ці гістарычныя, якія ўплываюць на даўнія адрозненні, што выпрацаваліся гісторыяй. Некаторыя эмацыянальныя рысы адрозніваюць людзей. Я назіраю розніцу паміж палякамі са Львова і палякамі з Вільнюса ці з Беларусі, але каб патлумачыць сутнасць гэтай розніцы, то трэба быць не толькі моваведам, але псіхолагам...

— Вы казалі, што каб чымсьці займацца (даследаваць), трэба гэта моцна любіць. На што параіце звярнуць увагу (даследаваць, цікавіцца) нам у беларускай культуры, каб атрымаць стымул любові?

— Я думаю, што вы можаце знайсці многае ў аўтэнтычнай гісторыі беларускіх зямель. У пісьменнасці, у нават пісьменнасці сучаснай. Я калісьці была вельмі ўражана, калі мне маладая студэнтка сказала, што яна не чытае Быкава, бо яе не цікавіць беларуская літаратура. А я кажу: «А ты хоць адну кнігу яго ўзяла ў рукі?.. Вазьмі і пабачыш, ці можна гэта не любіць...» Я захапляюся творчасцю розных пісьменнікаў. У вас жа ў 1920-я гады былі цудоўныя літаратары! Гэта не праўда, што ў Беларусі толькі Купала і Колас. Пачытайце ранняга Дубоўку!.. Мяркую, што з-за гістарычных умоў беларуская культура не мела стымулу паказаць сябе. А калі пакажаце, то ёсць чым пахваліцца: і архаікай цікавай, і пэўнай моўнай спецыфікай, і добразычлівасцю людзей. Многа гаворыцца адносна беларускай талерантнасці. Яна ёсць. Але талерантнасць — не значыць абыякавасць. ... Я маю шмат знаёмых сярод простых вясковых людзей, якія вельмі цэняць сваё. Напрыклад, сярод польскіх беларусаў. Калі я пачынала працу, вельмі часта сустракалася з такім акрэсленнем: «Мы папросту гаворым». Цяпер мала хто скажа «папросту», цяпер гавораць «па-свойму». Разумеючы: гэта наша мова. Гэта наша родная мова. Так што ўзровень свядомасці, на маю думку, расце. Калісь гаварылі пра феномен «тутэйшых», чаму прысвечана Купалава драма. Слова «тутэйшыя» жывучае, але адначасова намнога часцей ужо сустракаем акрэсленне «беларусы».

Для таго, каб знайсці ўласную тоеснасць, ёсць гісторыя. У ёй знойдуцца адказы. І падказкі. Для мяне, як для даследчыка, з'яўляецца істотным, што на працягу не аднаго стагоддзя, калі беларуская шляхта альбо паланізавалася альбо русіфікавалася з-за нейкіх сацыяльных авансаў, з беларускай мовай заставаўся просты вясковы народ. Дзякуючы гэтаму народу беларуская мова трывае, яна перажыла за стагоддзі ўсе перыяды неспрыяльныя для яе развіцця, гэта самае галоўнае. Тое, што мова жыве — факт паказальны. Значыць, яна мае пэўную каштоўнасць для людзей.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«БЕЛАЯ РУСЬ»: КАБ ВЫЙГРАВАЦЬ — ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ

Пра сканчэнне сезона адпачынкаў, лета і вяртанне да надзённасці сведчыць не толькі надвор'е. Новы палітычны сезон распачало Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь». У Мінску ўчора адбылася чарговая нарада яго Рэспубліканскага Савета.

Абмяркоўвалі пытанні стратэгічныя. Гаворка на сустрэчы кіраўніцтва РГА «Белая Русь» ішла аб падрыхтоўцы і ўдзеле структур арганізацыі ў палітычнай кампаніі 2014 года па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў XXVII склікання.

Аб тым, з чым на будучыя выбары ідзе «Белая Русь», расказаў старшыня аб'яднання Аляксандр Радзькоў.

— Арганізацыя набірае сілу, — падкрэсліў Аляксандр Міхайлавіч. — Зараз нас 140 тысяч. Гэта 2,5 працэнта ад усяго працаздольнага насельніцтва краіны. Адметна, што моладзь складае 26 працэнтаў у складзе «Белай Русі». Больш за 40 працэнтаў членаў арганізацыі працуюць у сферы адукацыі. Да нас прыходзяць новыя ініцыятыўныя і энергічныя людзі. Там, дзе яны ўзначальваюць «пярвічкі», адразу пачынае віраваць жыццё: так адбылося ў Лунінцы, Лельчыцах, іншых кутках Беларусі. Але трэба ісці да людзей не толькі ў гарадах, варта не забывацца на раёны, на вёскі.

«Белая Русь» пашырае і міжнародную дзейнасць: падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з польскай партыяй «Самаабарона», латвійскай партыяй «Згода», выказалі намер аб супрацоўніцтве прадстаўнікі Народна-дэмакратычнай партыі Таджыкістана.

Аляксандр Радзькоў выказаў свае адносіны да дыскусіі аб тым, ці павінна «Белая Русь» станавіцца палітычнай партыяй: «Так, мы моцная палітычная сіла, мы падтрымліваем Прэзідэнта. І грамадскасць добра ўспрымае «Белую Русь» у гэтай якасці. але большасць людзей ставіцца да партыйнасці сёння негатыўна: маўляў, раней была КПСС, а зараз партыі з'яўляюцца нейкімі маргінальнымі плынямі».

Для любой палітычнай грамадскай сілы выбарчая кампанія ў структуры ўлады — гэта момант ісціны. Бо праз выбары, агітацыю ёсць магчымасць прыйсці ў кожны рэгіён. На думку Аляксандра Радзькова, акрамя традыцыйных прыхільнікаў «Белай Русі», арганізацыя павінна больш шчыльна працаваць з прыватнымі прадпрымальнікамі — гэта кемлівыя, крэатыўныя, дзёрзкія людзі.

Але як і ўсякая палітычная сіла, якая паважае сябе, «Белая Русь» уважліва прыглядаецца да моладзі. Аб тым, як прывабіць да сваіх ідэй тых, хто праз пяць-дзесяць гадоў будзе вырашальнай сілай у грамадстве і краіне, думаюць усе палітыкі. «Белая Русь» настроена таксама рашуча. Мала таго, што амаль кожны трэці ў арганізацыі — малады чалавек да 31 года, дык яшчэ было вырашана пазнаёміць з «Белай Руссю» беларускае юнацтва — праз мастацкія, журналісцкія творы іх аднагодкаў. У сакавіку аб'яўлены конкурс журналісцкіх работ «Залатое пяро Белай Русі». Учора ўзнагародзілі пераможцаў вышэйназванага конкурсу творчых работ у галіне журналістыкі, які праводзіла для юных фатографаў, кінааматараў, журналістаў і блогераў. Зразумела, што тэмы творчага палёту павінны былі быць звязаны з той дзейнасцю, якую праводзіць грамадскае аб'яднанне. На суд журы было прадстаўлена 350 работ. Арганізатараў конкурсу відавочна парадавала геаграфія — шмат удзельнікаў з невялікіх гарадоў і вёсак. Але самым кранальным момантам цырымоніі ўзнагароджання стала знаёмства са сталічнай пераможцай — Крысцінай Скуратовіч. Бо да журы і ўсяго Рэспубліканскага Савета «Белай Русі» звярнулася маці дзяўчынкі: са слязамі ўдзячнасці яна расказала, што сама шмат гадоў таму прыехала ў Беларусь з Арменіі, працуе настаўніцай, на беларускай зямлі нарадзіла і выгадавала чатырох дзяцей і ганарыцца тым, што яны — беларусы. Калектыўным пераможцам сталі юныя маладзечанскія журналісты з клуба «Маладзік» — яны здымаюць кіно, займаюцца фотасправай.

Калі ўзрадаваная прыемнымі прызамі моладзь з бацькамі і настаўнікамі адправіліся на экскурсію па Мінску, удзельнікі нарады шчыра віталі яшчэ аднаго героя дня — юбіляра, аднаго з заснавальнікаў «Белай Русі», Героя Беларусі Паўла Марыева. Неверагодна, але факт: гэтага прыгожага, годнага і мудрага чалавека віншавалі з 75-годдзем!

Ларыса РАКОЎСКАЯ.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Радзькоў узнагароджвае пераможцаў творчага конкурсу сярод моладзі.

ЗАНЯТАСЦЬ У МІНСКУ: ТОЛЬКІ ФАКТЫ

Самую высокую зарплату ў Мінску шукайце ў будаўнічых арганізацыях, фінансавай сферы і ў галіне высокіх тэхналогій.

Як заявіла начальнік упраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ, высокая аплата прапануецца па вакансіях кваліфікаваных рабочых будаўнічых прафесій — іх сярэдняя заработная плата складае звыш 6 млн рублёў. Даволі высокі ўзровень аплаты па вакансіях у фінансавай сферы, у сферы высокіх тэхналогій. Пры гэтым яна адзначыла, што наймальнік, паведамляючы аб вакансіі, паказвае самую нізкую мяжу аплаты працы — без надбавак і прэміяльных.

Але ўсё ж сярэдні ўзровень аплаты па большасці вакансій у Мінску складае 3 млн 800 тыс. рублёў — пры сярэдняй зарплаце ў чэрвені ў сталіцы 6 млн 700 тыс. рублёў.

•••

Сталічны рынак працы па-ранейшаму арыентаваны на рабочыя прафесіі, якія склалі на 1 ліпеня гэтага года 77,7% ад агульнай колькасці заяўленых наймальнікамі вакансій.

Найбольш запатрабаваны будаўнікі (арматуршчыкі, бетоншчыкі, муляры), а таксама вадзіцелі аўтамабіляў, прадаўцы, швачкі, слесары, электрагазазваршчыкі, цесляры, сталяры, электраманцёры, кандуктары, кантралёры-касіры, кухары і інш. Прычым 12% вакансій арыентаваны на некваліфікаваную і нізкакваліфікаваную рабочую сілу. Сярод спецыялістаў запатрабаваны інжынерныя кадры, урачы-спецыялісты, медыцынскія сёстры.

•••

Таццяна Кудзевіч адзначыла, што ў Мінску працягваецца пераразмеркаванне работнікаў са сферы вытворчасці ў сферу паслуг. Так, у апошняй зараз занята больш за 66% усіх працуючых. Зніжаецца занятасць насельніцтва ў буйным прамысловым сектары, на транспарце і ў сувязі. Сёлета ў першым паўгоддзі ў Мінску склаўся адмоўны баланс руху кадраў: колькасць прынятых на працу папоўніла колькасць звольненых толькі на 87,4%.

На 1 ліпеня ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Мінску склаў 0,1% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Асобы старэй за працаздольны ўзрост складаюць сёння 14% ад усіх тых, хто працуе ў Мінску. А ў сферах аховы здароўя і адукацыі кожны чацвёрты работнік дасягнуў пенсійнага ўзросту.

•••

У горадзе ў садзейнічанні занятасці ў студзені—чэрвені гэтага года мелі патрэбу 12 тысяч мінчан, з іх 7,2 тысячы былі зарэгістраваны як беспрацоўныя. Пастаянную або часовую працу атрымалі 5,8 тыс. чалавек, у тым ліку 3,5 тыс. беспрацоўных. Перыяд працаўладкавання ў сярэднім склаў менш за 2 месяцы. Прафесійная падрыхтоўка і перападрыхтоўка арганізавана для 413 чалавек, якія навучаліся па 30 прафесіях, найбольш запатрабаваных на рынку працы.

•••

Сярод зарэгістраваных беспрацоўных у сталіцы лідзіруюць мужчыны: яны складаюць 65%. Гэтую тэндэнцыю, калі беспрацоўе становіцца ўсё больш мужчынскім, спецыялісты назіраюць на працягу апошніх 6 месяцаў.

Сярэдні ўзрост беспрацоўных у Мінску складае 38 гадоў.

Гарадскімі ўладамі прымаюцца меры для прыцягнення беспрацоўных і незаняты грамадзян у будаўнічую галіну. Тым, хто звярнуўся ў службу занятасці, было выдадзена больш за 1,5 тыс. накіраванняў для працаўладкавання ў будаўнічыя арганізацыі горада. «У выніку працу ў гэтых арганізацыях атрымалі 542 чалавекі», — сказала Таццяна Кудзевіч.

•••

У горадзе расце прыток замежнай працоўнай сілы. Гэта звязана з актыўным прыцягненнем замежных інвестыцый. Усяго на працу ў Мінск па працоўных дагаворах прыцягнуты 6261 замежны грамадзянін. Па словах Таццяны Кудзевіч, каля 70% прыехаўшых на працу ў Мінск замежнікаў працуюць менавіта ў будаўнічай сферы. У асноўным гэта муляры, цесляры, бетоншчыкі, тынкоўшчыкі, страхары, электрамантажнікі, арматуршчыкі.

Большасць замежнікаў, якія працуюць у Мінску, — грамадзяне Кітая (33% ад агульнай колькасці), а таксама Узбекістана, Літвы, Латвіі, Турцыі.

•••

Субсідыі для арганізацыі ўласнай справы за мінулыя паўгода атрымалі больш за 120 беспрацоўных мінчан. Большасць з іх арганізавала прадпрымальніцкую дзейнасць у сферы паслуг. Гэта рамонтныя работы, рознічны гандаль, транспартныя паслугі.

Варта нагадаць, што субсідыі для адкрыцця ўласнай справы прадастаўляюцца беспрацоўным, зарэгістраваным у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, якія з-за сітуацыі на рынку працы не могуць атрымаць прыдатную працу і вырашылі арганізаваць значныя для горада віды прадпрымальніцкай дзейнасці.

Памер субсідыі складае 11 БПМ (1 БПМ, або бюджэт пражыткovага мінімуму, сёння раўняецца 1 млн 026 тыс. рублёў).

Святлана БУСЬКО.

■ Канферэнц-зала

АБНАЎЛЕННЕ ФОРМЫ І ЗМЕСТУ

Больш за тысячу чалавек прынялі ўдзел у абласной канферэнцыі педагагічных работнікаў, што адбылася ў Барысаве. На форуме падведзены вынікі мінулага навучальнага года, вызначаны праблемы і перспектывы далейшага развіцця сістэмы адукацыі вобласці.

Удзельнікі форуму звярнулі асаблівую ўвагу на маладых спецыялістаў, іх замацаванне, забеспячэнне жыллём, аказанне адраснай матэрыяльнай падтрымкі. Абмеркавалі яны і цесную сувязь мадэрнізацыі з аптымізацыяй сістэмы адукацыі. Сёлета на Міншчыне закрыюцца 29 устаноў адукацыі, а 24 будуць рэарганізаваны. Адначасова ў Салігорску адкрыецца новая школа на 720 месцаў, у структуру вобласці ўвойдзе і Мінскі дзяржаўны каледж харчовай прамысловасці. «Мадэрнізацыя прадугледжвае скарачэнне неэфектыўных расходаў з дапамогай пазабюджэтнай дзейнасці, уцягнення ў гаспадарчую дзейнасць будынкаў навучальных устаноў, якія вызвалілі, рэалізацыі адукацыйных праграм дарослага насельніцтва. Бясспрэчна, гэта і абнаўленне зместу адукацыі», — падкрэсліла **начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна Казак.**

Што датычыцца аптымізацыі (і, адпаведна, скарачэнняў), то яна ў сферы адукацыі будзе працягвацца. «Але ніякай трагедыі тут няма. У Стаўбцоўскім раёне ў адной са школ у класе займаюцца два чалавекі. Пра якасную адукацыю тут не можа ісці размова. Закрыццё школ — вымушаная мера, але мы стараемся, каб яе наступствы не былі балючымі для дзяцей, бацькоў, педагогаў, — заўважыў **губернатар Барыс Батура.** — Для школьнікаў арганізаваны падвоз да месца вучобы, а практычна ўсе настаўнікі працаўладкаваны».

На думку кіраўніка сталічнага рэгіёна, педагогі павінны змяніць падыходы ў навучанні матэматыцы, рускай літаратуры, гісторыі. Ёсць нават выкладчыкі, якія сцвярджаюць, што не варта выкарыстоўваць творы класікаў — Гогаля, Лермантава, трэба выкарыстоўваць герояў сучаснай літаратуры, якія нібы бліжэй дзецям. «Але як можна палюбіць літаратуру і гісторыю, не ведаючы іх?» — пацікавіўся губернатар.

Міністр адукацыі Сяргей Маскевіч параўнаў Мінскую вобласць з інавацыйнай пляцоўкай, дзе пастаянна развіваюцца рацыяналізатарства, вынаходніцтва, тэхнічная творчасць і прадпрымальніцтва. У рэгіёне створаны і паспяхова працуюць школьныя бізнес-кампаніі. І гэта правільны кірунак, таму што якасць адукацыі — не толькі вынікі вучобы, але і ўмовы, якія маюць на ўвазе комплекснае развіццё.

Міністр падкрэсліў, што перад сістэмай адукацыі вобласці стаіць задача ствараць рэсурсныя цэнтры па кірунках эканамічнай дзейнасці, актывізаваць работу па ўкараненні распрацовак юных вынаходнікаў. Сёлета ў 71 бізнес-кампаніі працуюць звыш 5 тыс. дзяцей. За 2012–2013 навучальны год зароблена звыш 137 млн. рублёў. Частка сродкаў пайшла на зарплату юным бізнесменам.

У вобласці звыш 91 % настаўнікаў сярэдняй школы маюць вышэйшую адукацыю, больш за 78 % — вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыю, а 4 ужо атрымалі новае кваліфікацыйнае званне настаўнік-метадыст.

На 10 навучэнцаў прыходзіцца 1 камп'ютар, 77% установаў адукацыі аснашчаны відэатэхнікамі, практычна ўсе падключаны да інтэрнэту, маюць свае сайты. Гэтыя рэсурсы мяркуецца задзейнічаць для ўдзелу школьнікаў у дыстанцыйных алімпіядах, інтэрнэт-алімпіядах, для дыстанцыйнага навучання спецыялістаў.

Сяргей Маскевіч азнаёміўся з крэатыўнымі ідэямі і распрацоўкамі навучэнцаў. Напрыклад, у Капыльскім прафесійным каледжы пашылі сумку-трансформер, якая з дапамогай простых аперацый пераўтвараецца ў плашч. І такіх творчых распрацовак шмат. У рэспубліканскім конкурсе прадпрымальніцкіх ідэй «Мая ініцыятыва» лепшай стала работа Наталлі Чуйко з гімназіі № 1 Дзяржынска, якая дазволіла сістэматызаваць беларускі акраверш і падрыхтаваць да выдання спецыяльны паэтычны зборнік. На другім месцы работа Паўла Блінца і Яўгена Шаліка з сярэдняй школы № 3 Клецка па выкарыстанні ў якасці мікраскопа звычайнай ВЭБ-камеры. У намінацыі «Лепшы бізнес-план інавацыйнага праекта» пераможцам стаў жыхар Чэрвеня Ягор Невяроўскі з прапановамі па развіцці пекінскіх качак у хатніх умовах.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

МЕТРО ЗАПРАЦУЕ «ПА-ЗІМНЯМУ»

З 1 верасня цягнікі ў мінскай падземцы будуць рухацца з інтэрвалам у дзве хвіліны. Як сведчыць прэс-служба камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн», гэта змена распаўсюджваецца толькі на найбольш напружаны ў плане колькасці пасажыраў час: у першай палове дня з 7.00 да 9.00, у другой — з 16.00 да 19.00.

Традыцыйна з 1 чэрвеня па 31 жніўня метро працуе па летнім графіку. Паколькі на гэты час прыпадаюць канікулы ў студэнтаў і школьнікаў, а таксама вялікая колькасць працоўных адпачынкаў, пасажырапаток звычайна зніжаецца, інтэрвалы паміж цягнікамі становяцца больш доўгімі, скарачаецца колькасць саставаў, што выходзяць на лінію. Восенню ж «ціхі перыяд» заканчваецца і метро зноў пераходзіць на зімовы графік працы.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ДАДАТКОВЫ ЗАРОБАК У г. МІНСКУ

Сацыялагічная служба ажыццяўляе набор супрацоўнікаў для правядзення пакватэрных апытанняў насельніцтва ў г. Мінску. Дадатковы заробак, свабодны графік працы, які дазваляе праводзіць апытанне ў любы зручны час.

Асноўныя патрабаванні: камунікабельнасць, адказнасць, здольнасць выклікаць давер, выразная мова.

Тэлефанаваць з 14.00 да 18.00, акрамя суботы і нядзелі.

Кантактныя тэлефоны: 8 017 203 68 68,
8 029 877 74 68 (МТС), 8 029 303 92 33 (Велком).

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ГРАШОВЫЯ ДАХОДЫ СЁЛЕТА — ПЛЮС 20%

У першым паўгоддзі сёлета ўзровень грашовых даходаў насельніцтва склаў 203,7 трлн рублёў, або ў разліку на душу насельніцтва — 3 587,8 тыс. рублёў у месяц, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце Беларусі.

У структуры грашовых даходаў насельніцтва аплата працы займае 65,1%, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 9,9%, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і інш.) — 20,4%, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,6%. Атрымліваецца, што рэальныя наяўныя грашовыя даходы (за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) за шэсць месяцаў сёлета павялічыліся на 19,8% у параўнанні з адпаведным перыядам летась.

Сяргей КУРКАЧ.

КАМАНДЗІРОВАЧНЫЯ «ПАТАЎСЦЕЛІ»

У Беларусі павялічаны памеры пакрыцця выдаткаў пры службовых камандзіроўках у межах краіны, што прадугледжана пастановай Міністэрства фінансаў №53 ад 8 жніўня гэтага года, якая ўжо афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Цяпер за пражыванне па-за месцам жыхарства (у месцы знаходжання) для пакрыцця дадатковых асабістых выдаткаў сутачныя ўстаноўлены ў памеры 60 тысяч рублёў за кожны дзень камандзіроўкі. Раней гэтая сума складала 44 тысячы рублёў.

Сутачныя пры аднадзённых службовых камандзіроўках і камандзіроўках у іншую мясцовасць, якая знаходзіцца на нязначнай адлегласці ад месца пастаяннай працы, складуць 30 тысяч рублёў. Раней сутачныя ў такой сітуацыі былі ў памеры 22 тысяч рублёў.

У выпадку, калі сапраўдныя дакументы, што пацвярджалі б аплату выдаткаў па найме жылога памяшкання, будуць адсутнічаць, сума сутачных складзе 20 тысяч рублёў.

КУКУРУЗА ВЫСПЕЛА РАНЕЙ

Сельскагаспадарчыя арганізацыі краіны распачалі ўборку кукурузы на сілас, зялёны корм і на зерне.

Сёлета ўборачная плошча кукурузы на сілас і зялёны корм складае больш за 761 тысячу гектараў. Аб'ём нарыхтоўкі зялёнай масы прагназуецца на ўзроўні больш чым 20 мільёнаў тон. Ужо сабрана 679 тысяч тон зялёнай масы кукурузы пры ўраджайнасці 242,8 цэнтнера з гектара. З выхадам на масавую ўборку гэтай культуры прагназуецца рост ураджайнасці.

Уборку кукурузы на зерне распачалі на гэтым тыдні ў Гомельскай вобласці, дзе ўжо намалочаны пешыя 11 тысяч тон зерня пры ўраджайнасці 69,7 цэнтнера з гектара.

— Сёлета ўборка гэтай культуры на зерне распачалася прыкладна на тры тыдні раней, чым летась, што абумоўлена больш раннім яе выспяваннем. Чакаецца, што ў канцы жніўня — пачатку верасня ўборку кукурузу на зерне распачнуць і іншыя рэгіёны краіны, — паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.

Валавы збор зерня кукурузы ў бункернай вазе чакаецца сёлета на ўзроўні 2 мільёнаў тон.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З АНАЛАГАВАГА — У ЛІЧБАВЫ

У Белавежскай пушчы праходзіць 35-я сесія Міждзяржаўнага савета па геадэзіі, картаграфіі, кадастры і дыстанцыйным заніраванні Зямлі.

У склад названага савета ўваходзяць прадстаўнікі Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана. Ён быў створаны ў 1992 годзе і праводзіць узгодненую палітыку ў адпаведных абласцях, а таксама распрацоўвае нарматыўна-тэхнічную дакументацыю.

Удзельнікі сесіі маюць намер разгледзець пілотны праект інфраструктуры прасторавых даных краін СНД, а таксама ўнесці прапановы па фарміраванні адзінай геанавігацыйнай прасторы Садружнасці. Акрамя таго, на сесіі будуць узняты пытанні аб зняцці рэжымных абмежаванняў на некаторыя матэрыялы і даныя, створаныя ў сістэме геадэзічных кардынат 1942 года, праекта палажэння аб пераводзе матэрыялаў картографа-геадэзічных фондаў з аналагавага ў лічбавы выгляд, аб мадэрнізацыі электроннага бюлетэня змен геаграфічных назваў краін СНД.

Яна СВЕТАВА.

ДЗЕ АДНА, ТАМ І ДРУГАЯ?»

За правядзенне рэкламнай акцыі, якая была прызвана стымуляваць рэалізацыю алкаголю, начному клубу пагражае штраф.

Уладальнік забаўляльнай установы «Blackhall Bar» размясціў вонкавую інфармацыю пра рэкламную акцыю, па ўмовах якой пры набыцці бутэлькі любога алкагольнага напою наведнік клуба атрымліваў бы другую бутэльку ў падарунак.

Міністэрства гандлю ўбачыла ў дзеяннях уладальніка клуба парушэнне закона аб рэкламе ў частцы забароны на правядзенне рэкламных мерапрыемстваў у мэтах стымулявання рэалізацыі алкагольных напояў, а таксама ў частцы адносна недапушчэння рэкламавання дзейнасці, правядзенне якой забаронена заканадаўствам. Парушальніку вынесена прадпісанне аб спыненні правядзення названай акцыі і спыненні распаўсюджвання вонкавай рэкламы. Таксама вядзецца праца па прыцягненні яго да адміністрацыйнай адказнасці. У прыватнасці, гаворка можа ісці пра штраф у памеры ад 5 да 10 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАКАРАЛІ ЗА «ЗАБЫЎЧЫВАСЦЬ»

У Віцебскай вобласці прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці 4 работнікаў кантралюючых і наглядных органаў. Яны парушылі патрабаванні ўказа «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

— Выяўлены факты парушэння патрабаванняў вышэйзгаданага ўказа. Гэтым дакументам прадугледжана магчымасць унясення змяненняў у каардынацыйны план, а менавіта пераносу тэрмінаў правядзення праверак, выключэння кантралюючых (наглядных) органаў са складу сувыканаўцаў шляхам накіравання паведамлення ў адрас абласнога Камітэта дзяржаўнага кантролю. Аднак работнікі Пастаўскага райвыканкама, аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» і г.д. запланаваныя праверкі не правялі, а накіраваць адпаведнае апавяшчэнне аб унясенні змяненняў у каардынацыйны план «забыліся», — паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Па патрабаванні Камітэта «забыўчывыя» кантралёры былі пакараны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск» извещает своих акционеров о проведении 6 сентября 2013 года внеочередного общего собрания акционеров.

Повестка дня:

1. О выплате дивидендов.

Собрание состоится в 15.00 в здании ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск», по адресу: **г. Витебск, ул. «Правды», 5.**

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по состоянию реестра на 28 августа 2013 года.

Регистрация акционеров проводится с 14.30 до 15.00.

Акционерам при себе иметь паспорт, представителям — доверенность.

Справки по телефону *(8 0212) 60 28 93.*

С материалами собрания можно ознакомиться с 29 августа 2013 года в общем отделе ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 5.

Наблюдательный совет

УНП 300029266

УСЕ КОЛЕРЫ БЫХАВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праваслаўныя вернікі чакаюць, што арыгінал абраза, які захоўваецца ў жаночым манастыры паблізу аграгарадка Баркалабава Быхаўскага раёна, прывязуць у горад, каб паказаць гасцям захаваную старажытную святыню. Над асноўнай святочнай пляцоўкай праглядаюцца купалы і званіца Свята-Троіцкай царквы, якая знаходзіцца непадалёк і сама па сабе з'яўляецца вельмі прыгожым драўляным будынкам.

ГЕНЕРАЛЬНАЕ ПРЫБІРАННЕ

Побач з асноўнай пляцоўкай — Быхаўскі замак, вядомая гісторыка-культурная каштоўнасць. У яго двары таксама працуе шмат людзей і тэхнікі. Ад вуліцы да замка вядзе выкладзеная пліткай дарожка, абапал якой — старадаўнія ліпы і клёны. Руіны асноўнага замкавага будынка ачышчаны, а каля іх выклалі пляцоўку, дзе на свята будзе адбывацца тэатралізаваная дзея з удзелам рыцарскіх клубаў. Вежы, якія планавалі адрэстаўраваць да Дня беларускага пісьменства, яшчэ ў будаўнічых лясах. Але яны накрыты дахамі, на сцены пакладзена тынкоўка.

Рэстаўрацыя замкавых вежаў ідзе да завяршэння.

Кінатэатр «Радзіма»: да 100-гадовага юбілею атрымае «3D».

— Мы не сумняваемся, што ўсё паспеем, — сказала ад імя раённай улады Нэла Шунькіна. — Свята адбудзецца, як і запланавана, 1 верасня.

Увогуле такое ўражанне, што ўвесь горад удзельнічае ў добраўпарадкаванні. Замест рамонтных агароджаў з'яўляюцца новыя клумбы з кветкамі, зялёныя газоны — народ з граблямі і лейкамі выйшаў на генеральнае прыбіранне Быхава да свята.

Увогуле толькі ў раённым цэнтры адрамантавана, прыведзена ў парадак і падрыхтавана да Дня беларускага пісьменства 120 аб'ектаў. І ў раёне рыхтуюцца прымаць гасцей: цяпер актыўная работа ідзе на дарогах, якія вядуць да Быхава. Брыгады абразаюць старыя дрэвы, косяць траву абапал дарог, і нават калонкі пафарбавалі ў яркі блакітны колер. Вяскоўцы клапоцяцца пра свае дамы і агароджы. У прыдарожных вёсках буйства колераў і кветак у палісадніках, асабліва яркіх вяргіняў, пакідае прыемнае ўражанне ў вандроўнікаў.

МАСТАЦКІ ПАДЫХОД

Павінна блішчэць і квітнець цэнтральная вуліца Леніна, дзе цяпер наводзяць апошні лоск. Двухпавярховыя жылыя дамы адрамантаваны, работы на іх завяршаюцца. Адно з самых сімпатычных, па меркаванні многіх, месца — каля Быхаўскага райвыканкама. На дамах, каля строгага будынка з калонамі намаляваны прыгожыя карціны, дзе прадстаўлены Быхаў старажытны і Быхаў будучага. Апошні пакуль у будаўнічых лясах (што сімвалічна), бо мастакі яшчэ працуюць.

Насупраць, на тэрыторыі дзіцячага садка, навялі парадак з фантанам і старой савецкай скульптурай дзяўчынкі. «Балерыну» і пастамент нанова пафарбавалі.

На вуліцы Леніна з'явіліся расцяжкі, адна з іх парадавала вечнай тэматыкай: «Самае дарагое — жыццё! Беражы яго!» Таксама прыемна адзначыць, што, нягледзячы на рамонт, у Быхаве не пацярпелі зялёныя насаджэнні: горад па-ранейшаму застаўся зялёным.

КНІЖНЫЯ НАВІНКІ

Днямі адкрыўся абноўлены ўнівермаг Быхаўскага раённага спажывецкага таварыства. Акрамя таго, што звонку і ўнутры ўсё стала выглядаць сучасна, тут яшчэ з'явіўся і новы аддзел — «Кнігі».

Насупраць увахода ў краму выстаўлены шкляныя вітрыны з кнігамі. Гэта беларускія выданні: ад шыкоўных вялікіх энцыклапедый да мастацкіх кніг, у тым ліку і дзіцячых айчынных аўтараў.

— Так, у наш кніжны аддзел прывезлі сваю прадукцыю беларускія выдавецтвы, — ветліва паказвае прадавец Тамара Радкевіч. — Людзі прыходзяць, цікавяцца, пытаюцца. І будуць набываць абавязкова.

Сярэдні кошт кніг — ад 50 да 100 тысяч рублёў. Самая дарагая кніга — альбом жывапісу — каштуе больш за 700 тысяч рублёў.

— Але паглядзіце, якая яна прыгожая! — паказвае прадавец. — Вельмі карысная рэч для тых, хто шануе беларускае пісьменства.

СВЯТОЧНАЕ КАЛЬЦО

Арганізатары так размяшчаюць асноўныя пляцоўкі, каб утварылася святочнае кальцо, па якім будуць рухацца госці Дня беларускага пісьменства.

Каля старажытнага будынка сінагогі будуць выступаць тэатральныя калектывы Магілёўскай вобласці. Можна спыніцца каля кінатэатра «Радзіма»: у год свайго 100-гадовага юбілею і ў гонар Дня пісьменства тут набылі апаратуру «3D» і будуць паказваць «Кіно маёй краіны». Альбо пацікавіцца фантанам, каля якога ладзіць сустрэчы мясцовая моладзь. 1 верасня на гэтай плошчы прадставяць вядомыя фестывалі Магілёўскай вобласці.

«У здаровым целе — здаровы дух», — дарэчы нагадваюць у Быхаве і арганізуюць да Дня пісьменства спартыўную пляцоўку. Яна з'явіцца ў мікрараёне Быхаў-1, былым ваенным гарадку. Адкрыццё фізкультурна-аздараўленчага цэнтра, дзе ўжо чакае наведвальнікаў басейн для плавання, — гэта вялікая падзея для жыхароў Быхаўскага раёна.

СУСТРЭНЕМСЯ!..

Дарога далей вядзе да Прывакзальнай плошчы, дзе пакуль праязджае толькі цяжкая будаўнічая тэхніка, бо тут поўнай хадой кладуць новы асфальт. Гэтымі днямі завяршаюцца работы на новай аўтастанцыі і капітальны рамонт чыгуначнага вакзала. Будынак вакзала мадэрнізаваны, створаны новыя бытавыя памяшканні і санвузлы (што вельмі важна для вандроўнікаў), адрамантаваны касы.

Фота БЕЛТА.

Быхаў прэтэндуе стаць адным з галоўных турыстычных цэнтраў Беларусі. Такое меркаванне выказаў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік, які правёў учора ў Быхаве пасяджэнне Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, работы яшчэ, вядома, засталося вельмі шмат, але ўсё, што было запланавана, зроблена, і нават больш, таму няма ніякага сумнення, што ўсе будаўнічыя работы і работы па добраўпарадкаванні горада будуць завершаны ў тэрмін. «Усе, у тым ліку самі гараджане, працуюць з вялікім энтузіязмам. Яны разумеюць, што ў выніку ў Быхаве зменіцца якасць і ўзровень жыцця, з'явяцца сур'ёзныя перспектывы для развіцця. Важна таксама ўсё, што будзе зроблена, захаваць і кожны год прымнажаць», — падкрэсліў Анатоль Тозік.

У Магілёўскім аддзяленні Беларускай чыгункі паведамляюць, што амаль палова сродкаў (а гэта каля 4 мільярдаў рублёў) выдаткавана менавіта на добраўпарадкаванне навакольнай тэрыторыі. Тут паклалі новую плітку, разбілі клумбы, зрабілі невялікія зоны адпачынку, усталявалі асвятленне і відэаназіранне.

Аднак галоўным упрыгажэннем прывакзальнай плошчы ў Быхаве павінна стаць скульптура пад назвай «На ростанях»: пара маладых людзей, якія ці то сустракаюцца, ці то развітваюцца (у залежнасці ад вашага настрою і бачання), і хлопец трымае ў руках стос кніг беларускіх класікаў.

ГОРАД НЕ ПАЗНАЦЬ

Людзі, якія прыязджаюць у госці да быхаўскіх сваякоў і сяброў, кажуць, што проста не пазнаюць горад.

— У такой правінцыі прыемна жыць! — зайздросціць расіянка.

Мужчынская палова Быхава горда хваліць добрыя дарогі.

— Новы асфальт на нашых дарогах яшчэ блішчыць, — радуюцца аўтааматары.

Жанчынам вельмі падабаюцца крамы, у якія цяпер прыемна зайсці. Дзеці вяртаюцца дадому напрыканцы канікул і радуюцца пераменам.

— Мне падабаецца, што робяць новыя помнікі, — расказвае 16-гадовая ліцэістка Алена, якая, трымаючы ў руках руль веласіпеда, разглядае гістарычныя малюнкі на сценах дамоў. — Я выросла ў Быхаве, і мой горад стаў вельмі прыгожы.

— Мне хочацца пажадаць гасцям Дня беларускага пісьменства самых прыемных уражанняў, і пабольш — сказала намеснік старшыні райвыканкама Нэла Шунькіна. — Каб кожны ўбачыў у нас у Быхаве нешта новае і цікавае, што захацелася б увасобіць у сябе дома, на сваёй зямлі.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Быхаў.

■ Кватэрнае пытанне

Выселіць могуць. У тым ліку і за горад

Наша мама 1930 года нараджэння жыве асобна, да дзяцей пераязджаць адмаўляецца. Але і адной ёй вельмі цяжка. Найбольш з-за таго, што за сцяной жывуць людзі пітушчыя... Што цікава, за кватэру яны ўжо даўно не плацяць... Ці могуць іх за гэта выселіць? І куды?

С. Ткачук, г. Мінск.

У адпаведнасці з арт. 71 ранейшага Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, наймальнікі, якія ўхіляюцца без уважлівых прычын на працягу шасці месяцаў запар ад унясення платы за карыстанне жылым памяшканнем і камунальнымі паслугамі, маглі быць выселены па рашэнні суда з выдзяленнем жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў па агульнай плошчы меншага за тое, што займалася на ўмовах раней заключанага дагавора найму жылога памяшкання.

Згодна з арт. 86 новага Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь (увайшоў у сілу з 2 сакавіка 2013 г.) наймальнік і члены яго сям'і, якія пражываюць сумесна з ім і маюць без уважлівых прычын шасцімесячную запазычанасць па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі і плаце за карыстанне жылым памяшканнем, падлягаюць высяленню ў судовым парадку з выдзяленнем ім іншага жылога памяшкання, якое па агульнай плошчы меншае за жылое памяшканне, што займалася раней і (або) якое саступае яму па сваіх спажывецкіх якасцях, з захаваннем віду раней заключанага дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду і тэрміну яго дзеяння (калі дагавор найму жылога памяшкання быў складзены на пэўны тэрмін), у тым ліку за межамі гэтага населенага пункта. Пры гэтым высяленне наймальніка жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду і членаў яго сям'і, якія пражываюць сумесна з ім, дапускаецца ў выпадку, калі запазычанасць па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі і плаце за карыстанне жылым памяшканнем не пагашана ў поўным аб'ёме.

Як варыянт, пералічаныя вышэй асобы могуць быць падвергнуты ў судовым парадку прымусоваму абмену жылога памяшкання, якое яны займаюць, на жылое памяшканне, якое па агульнай плошчы меншае за папярэдняе.

Віктар САВІЦКІ

Віншуем з юбілеем сябра сям'і **Мечыслава Віктаравіча МОРХАТА**. Жадаем шчасця, здароўя, павагі і сямейнага дабрабыту.
Морхаты, в. Залеснікі.

■ Два бакі медаля

ПА СЛЯДАХ ЗАБІТАЙ АЛЬМЫ

У рэдакцыю прыйшоў ліст ад Святланы Грэкавай з Мінска. Жанчына сцвярджае, што работнікі «Фаўны горада» сярод белага дня жалезнымі прутамі збілі да смерці яе сабаку.

«ЛАЎЦЫ ЖЫВЁЛ ЗАБІЛІ МАЙГО САБАКУ, ЯКІ МІРНА СПАЎ У ДВАРЫ»

Паводле слоў Святланы, у той дзень, калі «расправіліся» з Альмай, яна знаходзілася ў бальніцы. «Падчас шпацыру з маім сынам Альма сарвалася з павадка. Адразу злавіць сабаку сын не змог, бо той схаваўся з віду. У той жа дзень людзі, апранутыя ў спецформу прадпрыемства «Фаўна горада», акружылі Альму, што спала на траве каля нашага дома, і стрэлілі ў яе ва ўпор. Сабака, са слоў відавочцаў, падскокнуў і пабег хавацца пад ганак. Лаўцы дагналі рудога дварняка… і сталі дабіваць жалезнымі прутамі, пасля чаго кінулі нерухомае цела ў машыну белага колеру».

На наступны дзень муж Святланы адправіўся ў «Фаўну горада». Але ў вальерах для жывёл Альму не знайшоў. Целы ж забітых сабак паказаць яму адмовіліся…

«Калісьці я выратавала Альму з «Фаўны горада» ад смерці: яе, дрыготкую, хворую, у крайняй ступені знясілення валаклі па калідоры ў кабінет эўтаназіі. Я літаральна выхапіла яе з рук… Але ж не для таго, каб праз некалькі гадоў ужо іншыя жывадзёры забілі яе ў нашым двары», — не стрымлівае эмоцый Святлана Грэкава.

«СУСЕДЗІ НЕАДНАРАЗОВА ПРАСІЛІ АДЛАВІЦЬ РУДОГА САБАКУ»

Паводле слоў **дырэктара прадпрыемства «Фаўна горада» Сяргея КУЗКІНА,** спецыялісты выязджаюць адлоўліваць безнаглядных жывёл згодна з планам, які складаецца на цэлы год. «Здараецца, ЖЭСы выклікаюць нас дадаткова. Іншыя арганізацыі, якія не звязаны з жыллёва-камунальнай гаспадаркай — інстытуты, заводы і г. д., таксама могуць рабіць заяўку на адлоў жывёлы». Што тычыцца гэтай канкрэтнай сітуацыі, то «ва УП «ЖЭС-73» неаднаразова скардзіліся жыхары дамоў №№ 30, 38, 44, 46, 54, 56/2 па праспекце газеты «Праўда»: прасілі адлавіць і ўсыпіць рудога сабаку, які пастаянна безнаглядна знаходзіцца ў двары і кідаецца на людзей. Акрамя таго, у нас ёсць пісьмовая заява ад грамадзянкі, якая пражывае ў

«Калісьці я выратавала Альму ад смерці. …Але ж не для таго, каб праз некалькі гадоў ужо іншыя жывадзёры забілі яе ў нашым двары»

доме № 46, са скаргай на гэтага сабаку і відэаматэрыялы нападу дварняка на мужчыну, які праходзіў міма…» «Тое, што сабака знаходзіўся ў двары жылых дамоў без уладальніка, з'яўляецца парушэннем правілаў утрымання хатніх сабак і котак, — дадаў Сяргей Кузкін. — За гэта, у адпаведнасці з артыкулам 15.47 «Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях», прадугледжана адказнасць. Больш за тое, я калісьці прасіў, каб нас надзялілі паўнамоцтвамі на складанне пратаколаў у дачыненні да людзей, чыіх жывёл мы падбіраем. Але маю прапанову, на жаль, не падтрымалі…»

У Мінгарвыканкаме ўдакладнілі, што супрацоўнікі «Фаўны горада» — кіроўца-лавец, лавец і ветурач — выехалі для адлову безнагляднага рудога сабакі па заяўцы УП «ЖЭС-73». Адлавіць жывёлу сачком не атрымалася, таму прымянялі спецыяльны прэпарат зоаксілазін, што не супярэчыць дзейнаму заканадаўству. Паводле тлумачальнай запіскі ветурача «Фаўны горада», сабака на прадпрыемства быў дастаўлены жывы. Аднак, улічваючы яго агрэсіўныя паводзіны, было прынята рашэнне аб усыпленні.

«Кожную адлоўленую жывёлу абавязкова аглядае ветурач, — патлумачыў Сяргей Кузкін. — Калі яна агрэсіўная або хворая, то яе, як правіла, усыпляюць». Паводле слоў дырэктара «Фаўны горада», безнаглядная лічыцца жывёла, побач з якой няма гаспадара. І тое, што на сабаку ёсць намордник ці ашыйнік, ні пра што не сведчыць. Законапаслухмяны гаспадар з павадка свайго гадаванца ніколі не спусціць — гэта вызначана правіламі ўтрымання жывёл». Пры гэтым дадаў, што сабака, прывязаны каля крамы за парэнчы, не падлягае адлову. Ён прывязаны — значыць, чакае гаспадара.

АД АЎТАРА

Лёс Альмы актыўна абмяркоўваюць у інтэрнэце. Так, жыхар таго раёна, які не раз сутыкаўся з рудым сабакам і яго гаспадыняй, піша, што без Альмы ўсяму раёну стала жыць спакойна і бяспечна. Мужчына сцвярджае, што сабака быў агрэсіўным і пастаянна бегаў

«Безнаглядная лічыцца жывёла, побач з якой няма гаспадара. І тое, што на сабаку ёсць намордник ці ашыйнік, ні пра што не сведчыць».

без павадка. «… У сярэдзіне сакавіка спадарыня Грэкава, як заўсёды, прыйшла са сваімі трыма вялікімі дварнякамі на працу. Пакуль яна падмятала (пенсіянерка працуе дворнікам), яе гадаванцы знайшлі сабе чатырохногіх сяброў, з якімі пачалі весці любоўныя гульні на адзінай дарожцы, якая вяла ў бок нашага дома. У гэты ж час са шпацыру вярталася мая жонка з паўтарагадовым дзіцем… На просьбу прыбраць сваіх сабак Грэкава не адрэагавала. Прыйшлося мне спусціцца і забраць

дзіця дадому. Пасля гэтага я паспрабаваў культурна растлумачыць жанчыне, што яна павінна глядзець за сабакамі… На ўсе заўвагі Святлана адказвала крыкамі і лаянкай»…

Многія інтэрнэт-карыстальнікі — на баку Святланы. Яны абураюцца «чарговай зверскай расправай над жывёламі» лаўцамі «Фаўны горада». Асабіста я не хацела б станавіцца на нечы бок. Хаця б таму, што нічога не бачыла на свае вочы. Скажу толькі, што не падзяляю тых метадаў, якія ўжылі (калі ўжылі!) працаўнікі службы па адлове. Разам з тым, і падобная безадказнасць гаспадароў, якія пакідаюць сваіх гадаванцаў на вуліцы без нагляду або,

Пакуль пенсіянерка падмятала, яе гадаванцы знайшлі сабе чатырохногіх сяброў, з якімі пачалі весці любоўныя гульні. У гэты ж час са шпацыру вярталася мая жонка з паўтарагадовым дзіцем…

што бачу амаль кожны дзень, адпускаюць з павадка, на мой погляд, недапушчальная!

…«Мой сабака прабягаў міма дзіцячай пляцоўкі, а муж і жонка вышлі на ганак і выстралілі ў яго з пнеўматычнага ружжа», — піша ў сеціве гаспадыня таксы па мянушцы Бой з вёскі Светлы Бор, што ў Пухавіцкім раёне. …Я ні ў якім разе не апраўдваю тых, хто страляў! Але тут жа ўзнікае пытанне: што рабіла такса адна без гаспадара каля дзіцячай пляцоўкі? І як у такой сітуацыі быць бацькам, чые дзеці штодзень гуляюць у пясочніцы? Заплюшчыць вочы і пакінуць усё так, як ёсць? Чакаць, пакуль малых пачнуць кусаць сабакі, якія гуляюць самі па сабе? А пасля кусаць локці… і абурацца ўсім светам, чытаючы артыкул пра тое, як руды дварняк ці такса да смерці пакусалі 2-гадовае дзіця.

І такіх гісторый хапае. Проста яны чамусьці не на слыху… Таму, думаю, варта ўсім, хто калісьці завёў альбо збіраецца завесці сабаку, перачытаць казку Экзюперы «Маленькі прынц». Перачытаць і ўразумець нарэшце, што «мы ў адказе за тых, каго прыручылі…».

Надзея ДРЫЛА

■ Спорт-тайм

З эстонскай разважлівасцю...

перамагла беларуская зборная па баскетболе ў першым паўфінальным матчы кваліфікацыі Еўрабаскета-2015.

Яшчэ за некалькі дзён да сустрэчы з эстонцамі ў Магілёве галоўны трэнер беларусаў Руслан Байдакоў шчыра прызнаваўся, што апасаецца наступных апанентаў. Маўляў, каманда моцная, цяжка прыйдзецца. Гэты тэзіс пацвердзіў і ход паядынку. Нягледзячы на тое, што нашы хлопцы лідзіравалі амаль што ўвесь матч, прыбалты заўсёды былі на адлегласці выцягнутай рукі.

Небяспечная сітуацыя ўзнікла менш чым за дзве хвіліны да фінальнай сірэны. Трохачковы ў выкананні Крысціяна Кангура дазволіў гасцям скараціць адставанне да мінімуму. Але зрабіць яшчэ адзін крок наперад гасцям перашкодзіў Павел Ульянка, які праявіў ініцыятыву і выканаў дальні кідок. Тым не менш апошнія чатыры ачкі камандзе прынёс другі «ветэран» — Аляксандр Кудраўцаў. За матч вопытны атакуючы абаронца набраў 21 ачко, выдатна праявіўшы сябе не толькі ў атацы, але і на падборы.

У іншым выпадку можна было б сказаць, што перавага ў шэсць мячоў не такая ўжо і грунтоўная. Але эстонцы — сапраўды моцная дружына, перамогу ў якой трэба літаральна адбіраць. Так што радуемся выніковаму ліку 76:70 і чакаем гульні ў адказ, якая адбудзецца ўжо ў Таліне заўтра.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Самы выніковы гулец матча — Аляксандр Кудраўцаў.

НЕСТАНДАРТНЫ ВАРЫЯНТ

У матчы плэй-оф Лігі Еўропы «Мінск» прайграў бельгійскаму «Стандарду» — 0:2.

Можна доўга разважаць, наколькі не пашанцавала футбольнаму клубу «Мінск» у першым раўндзе плэй-оф Лігі Еўропы трапіць на досыць моцную каманду еўрапейскага ўзроўню — бельгійскі «Стандард». Безумоўна, розніца ў майстэрстве гульцоў дзвюх дружын ёсць. І хатні матч «гараджан» з бельгійскімі гасцямі паказаў, што разрыў гэты істотны.

Не, справа не ў тым, што клуб з горада Льеж мае нейкі «зорны» склад. Хіба толькі вопытны паўабаронца Еле Ван Даме, колішні гулец легендарных «Аякса» і «Андэрлехта», можа пахваліцца больш-менш сур'ёзнай папулярнасцю. У астатнім «Стандард» адсоткаў на 70 укамплектаваны маладымі бельгійскімі футбалістамі, няхай у сваёй большасці і афрыканскага паходжання. Менавіта адзін з такіх «праспектаў» Мішы Бачуай і забіў першы гол у вароты Уладзіміра Бушмы на шостай хвіліне другога тайма. У тым гульнявым эпізодзе сербскі абаронца мінчан Неманья Рніч быццам і не думаў апякаць 19-гадовага сапернікa, які дакладна рваўся ў бой. Гэта ўдвая крыўдна, бо ў першым перыядзе падапечныя Вадзіма Скрыпчанкі вельмі грунтоўна выглядалі на сваёй палове поля.

Безумоўна, паўплывала выдаленне абаронцы «гараджан» Аляксандра Свярчынскага, які пабачыў ад арбітра дзве жоўтыя карткі. Дарэчы, «фалілі» мінчане недапушчальна многа і часцей за ўсё занадта адкрыта. Але асноўная прычына паражэння беларусаў, якая ляжыць на паверхні, — пасіўнасць у нападзенні. Досыць сказаць, што за ўвесь матч «гараджане» правялі пяць атак! Ды і тое… толькі адна з іх магла завяршыцца паспяхова. Але японскі варатар «Стандарда» зрабіў проста неверагодны «сейв», адбіўшы мяч, які ляцеў у самую «дзявятку» пасля ўдару Дзмітрыя Гарбушына.

Зусім разгубіўшыся, падапечныя Вадзіма Скрыпчанкі прапусцілі і другі гол ад яшчэ аднаго маладога бельгійца Фрэдэрыка Бюло. У гэтым выпадку не можа не здзіўляць, наколькі рацыянальна футбалісты з Льежа рэалізавалі ўсе свае шанцы. Бо, не дэманструючы нейкай завоблачнай гульні, атрымаць перамогу над сапернікам, які гуляе амаль што на сваім максімуме, — гэта сапраўднае майстэрства.

Поўную перавагу бельгійцаў пасля матча адзначыў і **галоўны трэнер мінчан Вадзім Скрыпчанка:** «„Стандард“ быў мацнейшы ва ўсіх кампанентах гульні. А мы правялі матч вельмі нясмела. Выдаленне Свярчынскага прымусіла больш шчыльна дзейнічаць у абароне. Адсюль недастатковая колькасць атак і назапашаная да канца матча стомленасць. Трэба абстрагавацца ад гэтага выніку і пастарацца згуляць у Льежы больш рашуча. Гэта праграма мінімум».

У гасцях «Мінск» згуляе ўжо 29 жніўня. А раптам у «гараджан» атрымаецца і ў гэты раз заскочыць у апошні вагон…

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

Краіна здароўя

Выпуск № 8 (309)

■ Інфарм-укол

СОН ПАВІНЕН БЫЦЬ

Дрэнны сон уплывае нават на паўсядзённыя стасункі ў пары. Заўважана, што той з партнёраў, хто не высыпаецца, часта бачыць у сне кашмары, становіцца незадаволеным, скардзіцца на жыццё і абвінавачвае другога ў тым, што яго не цэняць або не надаюць яму належнай увагі.

Даследчыкі з Універсітэта Бэрклі апыталі 60 пар рознага ўзросту і высветлілі, што тыя людзі, чый сон быў горшым, аказваліся больш нецярпімымі і раздражнёнымі. Існуе шмат прычын, па якіх чалавек можа не высыпацца: гэта і храп, і шум з суседняга пакоя, і перагрузкі на працы і г.д. Эксперты нагадваюць, што паўнацэнны сон надзвычай важны для фізічнага і псіхічнага здароўя чалавека. Паводле апошніх звестак, здаровым лічыцца сон працягласцю не менш за 8 гадзін.

ЛЯЧЫЦЕСЯ БЕЗ... ГРЭЙПФРУТА

Грэйпфруты, лайм здольныя павялічваць дзеянне лекаў і тым самым узмацняць самыя розныя пабочныя эфекты ад іх уздзеяння. Агульнавядома, што ідэальнае спажыванне лекаў — запіванне іх выключна пітной негазаванай вадой.

Канадскія вучоныя высветлілі, што існуюць 85 лекавых сродкаў, не сумяшчальных з некаторымі цытрусавымі. Яшчэ некалькі гадоў таму размова ішла аб 17 такіх прэпаратах. Справа ў тым, што менавіта сок грэйпфрута і лайма змяшчаюць спецыфічныя рэчывы, якія ў спалучэнні з лекавай тэрапіяй адмоўна ўплываюць на працу арганізма. А таму падчас прыёму лекаў рэкамендуецца выключыць з рацыёну цытрусавыя.

НА СНЯДАНАК — БЯЛОК

Багаты бялком сняданак зніжае патрэбу ўжываць ежу з высокай колькасцю тлушчу і цукру ў вячэрні час. Такую ўзаемасувязь устанавілі даследчыкі Універсітэта Місуры.

Мяркуецца, што ўжыванне сняданку з высокай колькасцю бялку прыводзіць да павелічэння пачуцця сытасці. Некаторыя з тых, за кім назіралі даследчыкі, адмаўляліся ад высокакаларыйнай ежы ўвечары. Для сняданку з бялковай ежы падыходзяць яйкі, ялавічная адбіўная, піражкі з ялавічынай, ёгурт, тварог.

КОЛЬКІ ЁСЦЬ — СТОЛЬКІ І НОРМА!

Інтэрнэт-прастора спрабуе высветліць, што ёсць норма ў сэнсе колькасці партнёрак для сексуальна актыўнага мужчыны. На самой справе, паняцце нормы ў сексалогіі — гэта, хутчэй, адсутнасць нормы як такой. Так, ёсць паталогіі, якія патрабуюць лячэння ў сексолага, уролага, андролага, і паралельна для жанчын — у сексолага і гінеколага.

Аднак нельга сцвярджаць, што ёсць нейкія аптымальныя мінімумы і максімумы, скажам, па колькасці палавых партнёраў. Тут усё залежыць ад выхавання, ад навязаных грамадствам і той жа інтэрнэт-прасторай «стандартаў», ад шэрагу ўласных псіхалагічных установак і, нарэшце, ад фізіялогіі асобна ўзятага чалавека. Словам, сэксуальная сфера — гэта... тая сфера, у якой галоўную ролю адыгрываюць і галаўны мозг, і гарманальны фон. Так што калі ў наступны раз прачытаеце, што для мужчыны нормай лічыцца ад 10 да 12 (15, 50) сексуальных партнёрак на працягу жыцця, не бярыце блізка да... І да сэрца таксама.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ На вагах

У ЧЫМ ПРЫЧЫНА ДЗІЦЯЧАГА АТЛУСЦЕННЯ?

Рост колькасці дзяцей з лішняй вагой тлумачыцца ў першую чаргу няправільным харчаваннем і малярухомым ладам жыцця. Радзей атлусценне з'яўляецца вынікам захворванняў эндакрыннай сістэмы, пухлін галаўнога мозга і іншых сур'ёзных захворванняў. А таму высвятляць прычыну атлусцення неабходна як мага раней.

Атлусценне ў дзіцячым узросце павышае рызыку ранняга развіцця цукровага дыябету, артэрыяльнай гіпертэнзіі, захворванняў печані, жоўцевага пузыра, ішэмічнай хваробы сэрца, паражае ў будучым інфарктам міякарда, бясплоднасцю, нагадвае **інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ.** Устанавіць дакладную прычыну атлусцення можа толькі спецыяліст пасля агляду дзіцяці, размовы з бацькамі і некаторых дадатковых абследаванняў.

Калі лішняя вага была ўжо ад нараджэння, а таксама ёсць спазненне ў развіцці (дзіця пачало позна трымаць галоўку, позна сядзець, хадзіць, позна прарэзаліся зубы, ёсць ацёчнасць твару), то не выключана, што атлусценне абумоўлена прыроджаным **недахватам гармонаў шчытападобнай залозы — гіпатэрыёзам.**

Атлусценне ў спалучэнні з разумовай адсталасцю, мышачнай слабасцю, касавокасцю, можа ўказваць на прыроджанае генетычнае захворванне — напрыклад, **сіндром Даўна, сіндром Прадэра-Вілі.**

Калі лішняй вазе спрыяе слабасць, стамляльнасць, санлівасць, дрэнная паспяховасць у школе, зніжаны апетыт, запоры, сухасць скуры, «мяхі» пад вачыма, то, магчыма, размова ідзе пра **набыты з-за дэфіцыту ёду або захворванняў шчытападобнай залозы гіпатэрыёз.** Гіпатэрыёз, які развіўся ў дзяўчынкі падчас палавога выспявання, можа стаць прычынай аменарэі (адсутнасці менструацыі) або іншых парушэнняў менструальнага цыкла.

Калі лішак тлушчавай тканкі назіраецца на шыі, твары, жываце, а рукі і ногі застаюцца тонкімі, шчокі ярка-руковыя, на скуры жывата з'яўляюцца фіялетавыя расцяжкі (стрыі), то верагоднай прычынай атлусцення будзе **сіндром Іцэнкі-Кушынга.** Гэта захворванне, пры якім у арганізме выпрацоўваецца лішак глюкакартыкоідаў (гармонаў надныračнікаў). Калі такі сіндром развіваецца ў дзяўчынак падчас палавога выспявання, то ў іх назіраецца адсутнасць менструацыі і гірсутызм (з'яўленне валасоў над верхняй губой, падбародку, малочнай залозе).

Калі атлусценне ўзнікла праз нейкі час пасля траўмы галавы, запаленчых захворванняў галаўнога мозга (менінгіт, энцэфаліт), нейрахірургічнай аперацыі (разрыў анеўрызмы мазгавой артэрыі), то атлусценне можа быць абумоўлена **недахватам функцыі гіпофізу**. Гэтая залоза ўнутранай сакрэцыі галаўнога мозга выпрацоўвае гармоны, якія стымулююць функцыі іншых эндакрынных залоз (шчытападобнай, надныračнікаў, палавых і інш.), а таксама гармон росту. Пры недахваце гармонаў гіпофізу не хапае гармонаў усіх астатніх залоз, што і з'яўляецца прычынай атлусцення, малога росту, гіпатэрыёзу і парушэння развіцця палавой сістэмы.

Атлусценне ў спалучэнні з галаўным болем, ванітамі, млосцю, галавакружэннем можа ўказваць на **пухліну галаўнога мозга або гіпофізу.**

Атлусценне ў дзяўчыны ў спалучэнні з тлустай скурай твару, нерэгулярнымі менструацыямі, ростам валасоў на твары і малочных залозах можа ўказваць на **сіндром полікістозных яечнікаў.**

Лішняя вага ў падлеткаў можа прывесці да:

- нехарактэрных для дзіцячага ўзросту гіпертанічнай хваробы, ішэмічнай хваробы сэрца;
- цукровага дыябету 2 тыпу;
- хранічнага халецыстыту (запаленне жоўцевага пузыра), панкрэатыту (запаленне падстраўнікавай залозы), тлушчавага гепатозу, а пасля і цырозу печані, запараў, гемарою;
- дэфармацыі коснага шкілета, болю у суставах, разбурэння сустаўных храсткоў, плоскаступнёвасці;
- расстройстваў сну (храп, апноэ — эпізоды адсутнасці дыхання).

ЛЯЧЭННЕ АТЛУСЦЕННЯ

*1. **Дыета і фізічная актыўнасць***

Дыету варта абмеркаваць з лечачым урачом або ўрачом-дыетолагам. Урач улічвае патрэбы ў бялках, тлушчах, вугляводах, макраэлементах, вітамінах.

Фізічная актыўнасць уключае любыя віды спорту, фізкультуру, актыўныя гульні на свежым паветры, плаванне.

Як разлічыць аптымальную колькасць калорый?

1. Падлічыце колькасць калорый, неабходных для падтрымкі жыццядзейнасці арганізма.

Моцная палова: 66+(маса цела х 13,7) + (рост у см х 5) — (узрост у гадах х 6,8).

Прыклад. Мужчына, маса цела 95 кг, рост 175 см, узрост 39 гадоў.

66+ (95 х 13,7) + (175 х 5) — (39 х 6,8) = 2508 ккал.

Прыгожая палова: 655 + (маса цела х 9,6) + (рост у см х 1,8) — (узрост у гадах х 4,7).

Прыклад. Жанчына, маса цела 65 кг, рост 166 см, узрост 40 гадоў.

655 + (65 х 9,6) + (166 х 1,8) — (40 х 4,7)= 1765 ккал.

2. Да колькасці калорый, неабходных для падтрымкі фізіялагічных працэсаў у арганізме, трэба дадаць калорыі, якія будуць затрачвацца на фізічныя нагрузкі.

Неабходна у выпадку маларухомага ладу жыцця памножыць вышэйназваную лічбу на 1,2, а ў выпадку фізічнай актыўнасці 2-3 разы на тыдні — на 1,4. Калі ў вас інтэнсіўная фізічная нагрузка, вы наведваеце трэнажорную залу, то памножыць трэба на 1,55.

Напрыклад, для вышэйзгаданай жанчыны, калі яна займаецца аэробікай, формула будзе наступнай: 1765 х 1,4 = 2472 ккал. Менавіта столькі калорый павінна ўжываць гэтая жанчына, калі жадае, каб яе вага заставалася ранейшай.

Калі ж у вас ёсць лішняя вага, значыць, ад атрыманай лічбы неабходна аднімаць 15-20 працэнтаў. Прыклад. 2472 ккал — 20% = 1944 ккал.

3. Дзённік харчавання і расходу энергіі. Рэкамендуецца пазначаць усё, што вы елі на працягу дня, з пазначэннем ужытых і патрачаных ккал.

Прыклады расходу энергіі пры фізічных нагрузках:

прагулка — 130-150 ккал у гадзіну
бег — 450-500 ккал у гадзіну
танцы— 250-700 ккал у гадзіну
гімнастыка — 250-450 ккал у гадзіну
скачкі цераз скакалку — 550 ккал у гадзіну
плаванне — 240-440 ккал у гадзіну

*2. **Лекі***

Урачы імкнуцца не прызначаць дзецям і падлеткам лекавыя сродкі для падаўлення апетыту без вострай неабходнасці.

*3. **Хірургічнае лячэнне.***

Дзецям яно праводзіцца вельмі рэдка, пры наяўнасці жыццёвых паказанняў, калі ёсць пагроза жыццю.

ЧАМУ НЕ ПАЖАДАНА ГАЛАДАННЕ І ХУТКАЕ ЗНІЖЭННЕ ВАГІ?

Лічыцца, што падчас пахудзення зніжэнне масы цела не павінна перавышаць 500-800 г за тыдзень.

Падчас галадання дэфіцыт энергіі ў арганізме папаўняецца за кошт глюкозы. Калі глюкоза ў крыві заканчваецца, пачынаецца расшчапленне запасаў глюкозы ў выглядзе глікагену. Запасаў глікагену ў арганізме хапае прыкладна на суткі галадання. Затым пачынаецца распад бялкоў, і ў апошнюю чаргу — тлушчавай тканкі.

Падчас імклівага скідвання вагі арганізм не паспявае адаптавацца да новага стану, што прыводзіць да абвісання скуры, мышачнай слабасці, парушэння работы стрававальнай сістэмы. Падчас спынення галадання пачуццё насычэння можа надыходзіць значна пазней, чым дагэтуль, і хуткая страта вагі прывядзе да імклівага яе набору. Гарантам захавання аптымальнай масы цела з'яўляецца раўнавага паміж спажываннем калорый і іх расходам.

Як падабраць рацыён харчавання?

У рацыён харчавання здаровага чалавека павінны ўваходзіць:

ГАРОДНІНА. Морква, сельдэрэй, бабы, кабачкі, таматы, бульба, шпінат і г.д. Паляпшаюць страваванне, змяшчаюць клятчатку, вітаміны, мінералы.

БЯЛКІ. Нятлустыя гатункі мяса, рыбы, яйкі, малочныя прадукты. Неабходныя для росту і аднаўлення пашкоджаных клетак, яны бяруць удзел амаль ва ўсіх фізіялагічных працэсах у арганізме.

ЗЕРНЕВЫЯ. Чорны хлеб, рыс, авёс, жыта, ячмень, грэчка і г.д. Клятчатка, вітаміны групы В.

ФРУКТЫ. Яблыкі, апельсіны, клубніцы, ківі, бананы, грушы і г.д. Раслінная клятчатка, вітаміны і мінералы.

ПОЛІНЕНАСЫЧАНЫЯ ТЛУШЧЫ. Любыя алеі.

Якія прадукты лепш не ўжываць ці ўжываць вельмі рэдка?

Тлустае мяса, каўбасы, сасіскі, сала, чыпсы, крэкеры, здобу, цукеркі, салодкую газаваную ваду, алкаголь.

КОЛЬКІ РАЗОЎ У ДЗЕНЬ ТРЭБА ЕСЦІ?

Аптымальным лічыцца 5-разовае харчаванне, якое ўключае сняданак (25% сутачнага рацыёну), другі сняданак (5-10%), абед (30-35%), полудзень (20-25%) і вячэру (10-15%). Апошні прыём ежы павінен быць за 3-4 гадзіны да сну.

♦ Здаровае харчаванне мае на ўвазе разнастайнасць прадуктаў.

♦ Абмежаванне тлустага мяса і іншых прадуктаў жывёльнага паходжання — гэта зніжэнне рызыкі развіцця атэрасклерозу.

♦ У штодзённым рацыёне павінна быць як мага больш клятчаткі раслінага паходжання — не менш за 500 г фруктаў і гародніны.

♦ Пажадана варыць і гатаваць на пары.

♦ Пажадана зніжаць колькасць солі.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Май на ўвазе!

ПАГЛЯДЗІ САБЕ Ў ВОЧЫ

Як трэба?

У норме вочы маюць здаровы бляск, чыстую белізну бялкоў з ледзь выражанай сасудзістай сетачкай. Мяшкоў і цёмных кругоў пад вачамі не павінна быць, гэтаксама, як і прыпухласці верхніх павекаў. Вейкі выпадаць павінны, але гэта адбываецца вельмі рэдка і ў норме ніяк не ўплывае на іх гушчыню. Слёзная вадкасць неабходна для падтрымання пастаяннай вільготнасці на паверхні вочнага яблыка і раўнамерна размяркоўваецца пры мірганні павекаў. У яе склад, акрамя соляў, уваходзіць эфектыўнае прыроднае антыбактэрыяльнае рэчыва лізацым, якое засцерагае вочы ад інфекцыі.

Што павінна насцярожыць?

Паглядзіце сабе ў вочы. Будзьце ўважлівыя кожны раз, калі наносіце макіяж, даглядаеце скуру твару, проста папраўляеце прычоску. Звярнуць увагу на любыя змяненні бялкоў вачэй, павекаў і скуры пад вачамі.

❍ *Павышанае слёзацячэнне* можа з'явіцца з-за пападання ў вока іншародных прадметаў (такім чынам арганізм спрабуе пазбавіцца ад іх) або па прычыне банальнай прастуды.

❍ Успомніце, калі вы ў апошні раз высыпаліся? Недахоп сну прыводзіць да *свербу ў вобласці павекаў.* Варта добра выспацца — і гэты сімптом знікае.

❍ З-за бяссонніцы вочы таксама могуць пачырванець. Зрэшты, такі ж сімптом з'яўляецца, калі доўга знаходзіцца ў пракураным ці дрэнна асветленым памяшканні. Гэта адбываецца па прычыне доўгага напружання вочных мышцаў і недастатковага ўвільгатнення вочнага яблыка. Часцей маргайце — гэта дазволіць «абмыць» слёзнай вадкасцю вочы. Часам гэты сімптом з'яўляецца з-за інфекцыйнай хваробы павекаў — блефарыту або пры алергіі на касметыку.

❍ *Калі вы адчуваеце значнае ўвільгатненне вока, пачырваненне, затуманьванне зроку,* насцярожцеся — гэта могуць быць сімптомы глаўкомы, якая развіваецца.

❍ *Ячмень на воку* можа з'явіцца ў выпадку занесенай інфекцыі, пры аслабленым імунітэце, на фоне авітамінозу, захворванняў страўнікава-кішачнага тракта.

❍ *Частае непадкантрольнае вам мірганне* можа быць прыкметай захворвання нервовай сістэмы.

❍ Унутраная павярхня павекаў у норме павінна быць руковага колеру. *Калі колер стаў ярка-чырвоным,* то гэта гаворыць пра парушэнне кровазвароту або хваробу стрававальнай сістэмы. *Калі колер пабляднеў,* то гэта можа сведчыць пра нізкі гемаглабін і нават пра жалезадэфіцытную анемію.

❍ *Пажаўцелыя склеры* — паказчык дрэннай работы печані, жоўцевага пузыра, а ў некаторых выпадках інфекцыйнага гепатыту.

❍ *Ацёкі або мяшкі пад вачамі* ўзнікаюць па мноstве прычын: стрэс, стомленасць, выпітая позна ўвечары гарбата або кава, няправільная поза падчас сну, парушэнні ў рабоце сардэчна-сасудзістай або мочапалавой сістэмы.

❍ *Сінякі пад вачамі* могуць быць наступствам нервовага перанапружання: скура замаруджвае працэс вывядзення таксінаў і не насычаецца неабходнай колькасцю вільгаці і кісларoду. Калі вы курыце, то майце на ўвазе: нікацін звужае сасуды, скура адчувае недахоп кісларoду, у сувязі з гэтым і ўтвараецца яе сіняваты колер, асабліва ярка выражаны пад вачамі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ

■

■ Газета «Звязда» + www.doktora.by

ЗВЯРТАЕМСЯ ДА ГІНЕКОЛАГА

На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказала ўрач акушэр-гінеколаг кабінета паталогіі шыйкі маткі Гузэль ШЫНКЕВІЧ.

— У крыві выяўлены IgG 1:15. Аналіз мазка (ПЦР) станоўчы. У запісе — хламідыёз. Цяжарнасць праходзіць добра. Як і папярэдняя чатыры гады таму. Зараз — 30 тыдняў. Акушэрка прызначыла азітраміцын мне і мужу — 3 таблеткі (2 у першы дзень і 1 раніцай). Ці дапаможа гэта? Ці можна заразіцца хламідыёзам бытавым шляхам? Ці небяспечна гэта для першага дзіцяці? Якія ёсць рызыкі адносна антыбіётыкаў і самой інфекцыі на гэтым тэрміне цяжарнасці?

— Усіх жанчын, якіх бяруць на ўлік па цяжарнасці, абследуюць на наяўнасць інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам метадам ПЦР. Пры выяўленні хламідый прызначаецца антыбактэрыяльнае лячэнне. Антыбіётыкі з'яўляюцца асноўным сродкам лячэння і прызначаюцца індывідуальна, паводле пратакола вядзення цяжарных жанчын. Азітраміцын — адзін з антыбіётыкаў, рэкамендаваных для лячэння хламідыёзу ў цяжарных. Рызыка ўзнікнення ўнутрывантробнага інфіцыравання плода пры адсутнасці лячэння намнога вышэй, чым рызыка прыёму антыбіётыкаў на вашым тэрміне цяжарнасці. Бытавы шлях перадачы ІППШ не выключаецца, а таму необходна прытрымлівацца правілаў асабістай гігіены.

— Мне 24 гады. Была аперацыя па выдаленні кісты яечніка. Гісталогія паказала эндаметрыёз. Піла аральныя кантрацэптывы. Урачы кажуць, што калі ёсць схільнасць, значыць, верагодна паўторнае ўзнікненне, і рэкамендуюць нарадзіць. А цяжарнасць і роды ніяк не ўпісваюцца ў асабістыя планы ў бліжэйшай будучыні. Ці ёсць яшчэ якія-небудзь варыянты па папярэджванні ўзнікнення кіст? Якая верагоднасць узнікнення кісты пасля цяжарнасці і няўжо гэта так эфектыўна?

— Эндаметрыёз з'яўляецца гармназалежным захворваннем, пры якім слізістая абалонка маткі (эндаметрый) разрастаецца ў іншых аддзелах арганізма, дзе ў норме яго не бывае. Гэтае захворванне мае некалькі тэорый развіцця. Раней лічылася, што цяжарнасць вылечвае эндаметрыёз, пакольк і яна мінімум на 9 месяцаў прыпыняе гарманальныя хістанні ў жаночым арганізме. Меркавалася, што за гэты час анамальна размешчаныя ачагі эндаметрыёзу паспяваюць зменшыцца і знікнуць, магчыма, назаўсёды. На жаль, даследаванні не пацвердзілі гэта. Падчас цяжарнасці агульны стан можа крыху палепшыцца, аднак пасля родаў ачагі эндаметрыёзу зноў ажываюць. Эндаметрыёз часта суправаджаецца бясплоднасцю. Таму з цяжарнасцю цягнуць не варта.

— 24 гады. Аналіз маткі: лейкацыты 15-20, эрытрацыты 3-4, эпітэлій 6-8, удзельная вага 1019, бялок 0,041, цукар — няма. Цяжарнасць 3 тыдні ад зачацця, 5 — ад апошняй менструацыі. Частае болевае мочаспусканне. Калі падымаюся, цісне на мачавы пузыр. Ці можа гэта быць пазаматачная цяжарнасць? Парайце лекі ад цыстыту, які не нашкодзіць дзіцяці. Цяжарнасць трэцяя.

— Для пацвярджэння факта цяжарнасці неабходна правесці ўльтрагукавое даследаванне. Пры наяўнасці плоднага яйка ў матцы пытанне аб пазаматачнай цяжарнасці знімаецца. Пры паталагічным агульным аналізе мачы прызначаецца аналіз мачы па Нечыпарэнку і пасеў мачы. Калі выстаўляецца дыягназ цыстыту, выкарыстоўваюцца антыбактэрыяльныя прэпараты. Вам неабходна звярнуцца да ўрача.

— Было тры кесаравыя сячэнні. Падчас апошняй аперацыі зрабілі перавязкі труб. Месячныя ў маі і чэрвені былі з затрымкамі, а ў чэрвені я выпіла адну таблетку дыцыёну (кроваспыняльнае). У ліпені месячныя былі як да цяжарнасці. Аднак праз 1,5 тыдня пасля іх завяршэння паказаліся крывяністыя выдзяленні. Часам адчуваю боль у яечніках і адчуваю шоў, калі да яго раптам дакрануцца. Што гэта можа быць?

— Верагодна, у вас быў авуляторны сіндром. У сярэдзіне цыкла (13-14-ы дзень ад пачатку месячных) у жанчын адбываецца авуляцыя, якая часам суправаджаецца крывяністымі выдзяленнямі на працягу 3-4 дзён і болем у нізе жывата. Гэта абсалютна бяспечна. Але вам неабходна зрабіць ультрагукавое даследаванне органаў малога таза для выключэння іншых паталогій. Аднаўленне адчувальнасці скуры ў вобласці рубца пасля аперацыі кесарава сячэння адбываецца індывідуальна. У вас было тры аперацыі — магчыма і больш працяглае аднаўленне. Пакажыцеся хірургу для выключэння іншай паталогіі.

— Чацвёрты месяц у маці — боль у паху. Медыкі кажуць, каб яна звярнулася ў Мінск. З чаго пачаць?

— Вашай маці неабходна кансультацыя гінеколага, хірурга і тэрапеўта. Трэба зрабіць ультрагукавое даследаванне органаў малога таза, брушной поласці, здаць аналізы крыві і мачы. У Мінску гэта можна прайсці ў гарадскіх паліклініках, у тым ліку на платнай аснове, камерцыйных медыцынскіх цэнтрах.

— 28 гадоў, Мінск. Хацела б атрымаць кансультацыю па магчымасці цяжарнасці. 14,5 года таму мне зрабілі трансплантацыю правай долі печані ад жывога донара па прычыне хваробы Вільсана-Канавалава. Прымаю прэпараты — адваграф, урсасан, медрол. З лістапада 2012 года мы з мужам не засцерагаемся. Аналізы крыві і мачы ў норме. Здавала аналізы на гармоны, прайшла мікрабіялагічнае даследаванне. У мужа — варыкацэле з абодвух бакоў. Урач нічога не прызначыў. Аналіз спермаграмы ў норме.

— Пры адсутнасці цяжарнасці на працягу паўгода-года рэгулярнага палавога жыцця без кантрацэпцыі ўстанаўліваецца дыягназ бясплоднасці. Далейшае абследаванне жанчына павінна праходзіць у спецыялізаваных цэнтрах, дзе прымаюць спецыялісты гэтага профілю. Напрыклад, у РНПЦ «Маці і дзіця». У сувязі з цяжкай экстрагенітальнай паталогіяй вам неабходна атрымаць заключэнне аб магчымасці цяжарнасці. Варыкацэле, пры адсутнасці змяненняў у аналізе спермы, не з'яўляецца проціпаказаннем да цяжарнасці.

— 18 гадоў. Затрымка — тыдзень. Два тэсты былі адмоўнымі. Калі трэці будзе станоўчым, то на якім тэрміне можна рабіць вакуум? Куды лепш звяртацца, што для гэтага патрэбна? А калі цяжарнасці няма, то з чым можа быць звязана затрымка?

— Па такіх пытаннях заўсёды неабходна звяртацца да гінеколага па месцы жыхарства. Зараз ёсць магчымасць правядзення больш ашчаднага перарывання цяжарнасці на ранніх тэрмінах — медыкаментозны аборт. Гэта метад перарывання цяжарнасці спецыяльнымі прэпаратамі без траўматычнага ўваходу ў поласць маткі на тэрміне да 3 тыдняў цяжарнасці. Такі метад праводзіцца на платнай аснове. Мае проціпаказанні. Прычын, па якіх магла мець месца затрымка месячных, шмат: цяжарнасць, кісты яечнікаў, парушэнне менструальнага цыкла, стрэс, перамена клімату і інш. Вам неабходна даабследавацца — атрымаць кансультацыю гінеколага, зрабіць ультрагук органаў малога таза, здаць кроў на гармоны, прайсці кальпаскапію.

— 25 гадоў. Парваўся прэзерватыў. Цыкл — 25 дзён. Выпіла таблетку эскапелу. Падобная сітуацыя была ў лютым — парваўся прэзерватыў, тады выпіла пасцінор. Цыкл не збіўся. Гэта, напэўна, ударная доза гармонаў за апошнія некалькі месяцаў. Але так атрымалася. Сама вельмі перажываю. Буду запісвацца да гінеколага, але хацела б папытацца і тут...

— Пры актыўным палавым жыцці лепш карыстацца аральнымі кантрацэптывамі. Для гэтага, сапраўды, звярніцеся да свайго ўрача-гінеколага па месцы жыхарства. Пры частым выкарыстанні прэпаратаў экстраннай постконтактальнай кантрацэпцыі цыкл можа парушыцца. Усё індывідуальна.

— 22 гады, не раджала. Выявілі хранічны цэрвіцыт, які лячыла поліжынаксам. Эрозію прапануюць прыпячы. Ці трэба гэта рабіць? Эрозія крываточыла, сярэдніх памераў.

— Эрозіі шыйкі маткі ў жанчын, якія не раджалі, не прыпякаюцца. Да 22-24 гадоў эрозія шыйкі маткі — гэта прыроджаная эктапія гарманальнага характару, што з'яўляецца варыянтам нормы. Пры выяўленні хранічнага цэрвіцыту неабходна абследавацца на ІППШ метадам ПЦР, а таксама здаць пасевы з похвы з адчувальнасцю на антыбіётыкі. Пасля прайсці курс супрацьзапаленчага лячэння згодна з антыбіётыкаграмай. У далейшым трэба назірацца ў гінеколага. Штогод праводзіць цыталагічнае даследаванне, кальпаскапію і біяпсію пры неабходнасці.

— 23 гады. Год таму паставілі дыягназ «дэрмоідная кіста яечніка». Вырашыла зрабіць лапараскапію. Але ў бясплатнай клініцы трэба чакаць каля года. Гатова зрабіць і ў платнай, але куды звярнуцца?

— Ва ўсіх клініках Мінска ёсць аддзяленні платных паслуг. Вы можаце звярнуцца ў адну з клінік і атрымаць поўную кансультацыю аб неабходнасці і магчымасці правядзення лапараскапіі.

— 39 гадоў. Мінск. За маткай — кіста (трохкамернае эханегатыўнае ўтварэнне) 61х28х41, справа за маткай утварэнне 67х59х63, структура неаднародная, у каляматачным асяроддзі — свабодная вадкасць 45х19х41. Заключэнне: кіста левага і правага яечніка. Субмукозная міёма маткі або паліп эндаметрыя, кісты эндацэрвікса. Аналіз на анкамаркер: СА 125. Чым мне гэта пагражае? Якія аперацыі мне паказаны? Калі маркер будзе больш за 30 — гэта рак?

— Пры такім дыягназе будзе праведзена гістэраскапія з дыягнастычным выскрабаннем. У далейшым пры захаванні кіст — перадаперацыйнае абследаванне паводле пратакола. Аб'ём аперацыі і спосаб доступу вызначаецца хірургам. Норма СА 125<35.

— 19 гадоў. Кіста правага яечніка. Яна вырасла за месяц да 6 см. Кіста пастаянна турбуе — баліць, коле. Урач сказала праверыць кісту праз 2 месяцы. Але я адчуваю пастаянны боль. Мне здаецца, яна за гэты час можа лопнуць. Парайце, калі ласка, добрага гінеколага ў Мінску.

— Калі вас не задавальняе ваш гінеколаг, вы можаце перавесціся да іншага ўрача жаночай кансультацыі або прыйсці на прыём непасрэдна да яе загадчыка. Можаце звярнуцца ў камерцыйны медцэнтр або ў РНПЦ «Маці і дзіця», іншыя клінікі, у якіх на платнай аснове прымае ўрач-гінеколаг.

— Неабходна зрабіць лапараскапію яечнікаў. Гэта платная працэдура?

— Па накіраванні ўчастковага гінеколага лапараскапічнае ўмяшанне выконваецца бясплатна.

— Па якой прычыне можа крываточыць шыйка маткі? Не могуць паставіць дыягназ.

— Вам неабходна звярнуцца ў спецыялізаваны кабінет — кабінет паталогіі шыйкі маткі жаночай кансультацыі. Неабходна правесці пашыраную кальпаскапію, прыцэльную біяпсію. І тады вам паставяць дыягназ, прызначаць лячэнне.

— Гомельская вобласць. 43 гады. Апошнія чатыры гады адчуваю сябе не надта добра. Прыступы недахвату паветра, цямнее ў вачах, зямля знікае з-пад ног. Збой у менструальным цыкле. У абласным цэнтры шлюбу і сям'і геніколаг-эндакрынолаг паставіў дыягназ алігаменарэі ў перыменапаўзе, клімактэрычны сіндром. Прызначылі фемастон. Ці можна абысціся без гармонатэрапіі? Чула пра клімактаплан, трансверол раслінная паходжання.

— Лячэннем жанчын у перыменапаўзе займаюцца гінеколагі-эндакрынолагі. Прызначаны вам гарманальны прэпарат замяшчае вашаму арганізму тыя гармоны, якіх яму не хапае ў гэты ўзроставы перыяд. Магчыма выкарыстанне раслінных і гамеапатычных сродкаў. Калі вы адчуеце заўважнае паляпшэнне стану на фоне прыёму раслінных прэпаратаў — прымайце іх.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 32 (202)
ЗВЯЗДА 24 жніўня 2013 г.

■ Ведай нашых!

БОЛЬШ, ЧЫМ РОЛЯ

Акцёр Раман Падаляка прызнаны лепшым выканаўцам мужчынскай ролі на фестывалі ў Друскінінкаі.

У першым Міжнародным тэатральным фестывалі «Vasara-2013» браў удзел спектакль «Дзяды», прадстаўлены ўвесну «Тэатрам Ч». Паэма Адама Міцкевіча прагучала са сцэны па-беларуску дзякуючы прадзюсару Андрэю Чорнаму, які запрасіў да пастаноўкі рэжысёра з Літвы Рамунэ Кудзманайтэ. Акрамя таго, дапамагалі ствараць вобраз спектакля літоўская мастачка Надзея Гультаява і аўтар музыкі Фаустас Латэнас. А вось акцёрскі склад — наш, беларускі. Ролю галоўнага героя Густава-Конрада выканаў Раман Падаляка. Праца для яго была вельмі адказнай: вуснамі яго героя агучваюцца думкі самога аўтара, паэта Адама Міцкевіча. Гэта адзначылі на фестывалі ў літоўскім Друскінінкаі, дзе беларускі акцёр атрымаў перамогу ў намінацыі «Лепшая мужчынская роля». У фестывалі прымалі ўдзел тэатры Літвы, Расіі, Беларусі і іншых краін СНД. У нашага гледача будзе магчымасць паглядзець на Рамана Падаляку ў спектаклі «Дзяды» паводле Міцкевіча: менавіта гэтым спектаклем «Тэатр Ч» адкрые новы сезон.

Ларыса ЦІМОШЫК
■

НА АЎГУСТОЎСКІМ КАНАЛЕ 24 ЖНІЎНЯ ПРАДСТАВЯЦЬ КУЛЬТУРУ ТРОХ НАРОДАЎ

Фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў» адбудзецца 24 жніўня ў Гродзенскім раёне, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў райвыканкаме.

Мерапрыемствы традыцыйнага фестывалю пройдуць у раёне шлюза Дамброўка. Асноўнай яго падзеяй будзе выступленне творчых калектываў з Беларусі, Польшчы і Літвы. Артысты выступяць у спецыяльна збудаваным летнім амфітэатры.

Таксама ў гэты дзень тут будуць ушаноўваць працаўнікоў жніва — раённае свята «Дажынкі» ўключае ўрачыстае шэсце хлебаробаў і ўзнагароджанне лепшых.

Будзе працаваць выязны гандаль, дзіцячыя атракцыёны, адбудзецца выстаўка-кірмаш дэкаратыўна-прыкладной творчасці, спартыўныя спаборніцтвы. Вечарам пачнецца дыскатэка, якая прадоўжыцца да поўначы.

Фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў» пачаў праводзіцца на Аўгустоўскім канале па ініцыятыве Саюза палякаў на Беларусі. З 2006 года, пасля рэканструкцыі канала, маштаб мерапрыемства павялічыўся. Цяпер у лік арганізатараў таксама ўваходзяць гродзенскія абласны і раённы выканаўчыя камітэты.

■ Тэарт-2013

НАШ САД

Драматургія новая. Драматургія іншая. Але беларуская. Чаканая. Якую хочацца ўбачыць на сцэне. Бо гэта ці не лепшая магчымасць паглядзець на сябе збоку, толькі дзякуючы тым людзям, якія хочуць з табой жа пагаварыць пра цябе і паразважаць: а што ж з табой адбываецца? На якім свеце сёння пачуваецца чалавек, які жыве ў нашай краіне? Але рэпертуарныя тэатры аддаюць перавагу (калі ёсць нагода) класіцы. Так, і яна можа гучаць сучасна. Але ж у кожнага часу ёсць свае ідэі і свая патрэба іх увасаблення на сцэне.

Сёлета ў праграме міжнароднага тэатральнага праекта «Тэарт» нам збіраюцца паказаць беларускую праграму. І гэта вялікая справа: таму што сучасны тэатральны рух вядзе да ўзнікнення тэатральных праектаў, дзе ёсць пошук, эксперымент і новыя формы. Але самае галоўнае: ёсць думкі, якія прапаноўваюць для асэнсавання драматургі новай фармацыі. І яны хочуць быць пачутымі. Дзеля гэтага, напрыклад, узнікла ў нас Студыя альтэрнатыўнай драмы, калі коратка — САД. Адным з яе стваральнікаў быў Дзмітрый Багаслаўскі, малады драматург, п'есы якога добра ведаюць у Расіі (і ставяць нават такія вельмі вядомыя тэатры, як Маякоўскага ў Маскве). П'еса «Каханне людзей» ідзе ўжо ў 9 гарадах Расіі... Дзмітрый чалавек тэатральны — тры гады таму скончыў рэжысёрскі факультэт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. І хоць сам прызнаецца, што вялікі ўплыў на яго аказалі творы Марыса Метэрлінка, але незвычайнасць яго п'ес адзначана не на адным драматургічным конкурсе (сярод якіх, напрыклад, фестываль маладой драматургіі «Любімаўка-2011»). А ўжо на «Любімаўцы-2012» яго п'еса «Ціхае шапаценне сыходзячых крокаў» стала адной з пераможцаў.

У беларускага гледача будзе магчымасць пазнаёміцца са спектаклем паводле п'есы Дзмітрыя Багаслаўскага «Ціхае шапаценне сыходзячых крокаў» у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі ўжо ў верасні. А ў кастрычніку спектакль стане ўдзельнікам беларускай праграмы міжнароднага фестывалю «Тэарт». Пастаноўка ажыццявілася дзякуючы супрацоўніцтву з расійскай Міжнароднай канфедэрацыяй тэатральных саюзаў. Але самае цікавае ў гэтым: спектакль стварае рэжысёр з Кыргызстана Шаміль Дыйканбаеў, які працуе ў Кыргызскім нацыянальным тэатры, дзе стварыў лабараторыю сучаснай драматургіі. Яго зацікавіла спачатку менавіта п'еса «Каханне людзей», і было жаданне паставіць яе. Але аказалася, што ў Дзмітрыя ёсць новая п'еса...

— Выбар п'есы — гэта цікавая з'ява, — прызнаецца **Шаміль Дыйканбаеў.** — Я ведаю аднаго рэжысёра, які выбірае так: маўляў, ці не паставіць нам Шэкспіра?.. У мяне атрымліваецца па-іншаму: хочацца — менавіта гэтую. Вядома, на выбар ўплываюць яшчэ іншыя прычыны: што важна для грамадства, краіны, людзей, сярод якіх ты жывеш, з якімі кантактуеш.

Кантакты, дарэчы, дапамаглі рэжысёру і драматургу знайсці адзін аднаго: размова пра стварэнне сумеснага спектакля разам з Міжнароднай канфедэрацыяй тэатральных саюзаў вялася на фестывалі ў Кішынёве, дзе ўдзельнічалі прадстаўнікі беларускага Цэнтра сучаснай драматургіі. Яго задачай з'яўляецца папулярызацыя беларускай драматургіі. Дзеля папулярызацыі ладзіліся, напрыклад, чытанні п'ес беларускіх аўтараў. Хоць бы

Тэатр адгукацца на нейкія з'явы, факты з жыцця пераводзіць у факты мастацтва.

дзякуючы гэтаму ўжо магло з'явіцца ўяўленне, што наш тэатр ўсё-такі адгукаецца на жыццё сучаснікаў. Але каб п'есу паставіць, патрэбны яшчэ рэжысёр. Творчы свет такі: рэжысёр ставіць, як правіла, тое, што адчувае. І можа быць, для п'ес Дмітрыя Багаслаўскага і іншых маладых драматургаў, якія сёння вядомыя ў Расіі, проста яшчэ няма сваіх рэжысёраў у Беларусі? Наогул маладых рэжысёраў у нас не шмат, а іх пастаноўкі — рэдкія з'явы нагул. Такая рэчаіснасць: наш тэатр у асноўным рэпертуарны, больш традыцыйны, дзе трэба думаць пра запаўняльнасць залы і прыбытак ад квіткоў. Тут не рызыкнеш, таму з эксперыментамі зусім не проста. Выйсце не новае, вядомае — стварэнне альтэрнатыўных пляцовак, дзе якраз месца і для эксперыментаў, і для новых формаў, і нават для новых ідэй. У нас сёння такой пляцоўкай можа стаць Цэнтр беларускай драматургіі. І па яго працы адчуваецца, што ў моладзі ёсць цікавасць да новай драматургіі. **Аляксандр Марчанка,** яго кіраўнік, лічыць:

— Ёсць розныя маладыя рэжысёры. Ёсць Кацярына Аверкава. Але яе цікавасць — рабіць спектаклі на зразумелых умовах і на вядомых пляцоўках. Яна не першы год працуе. Тым не менш яна зрабіла ўвесну чытку п'есы Паўла Пражко «Тры дні ў пекле». Цудоўна атрымалася. Але яна хацела б бачыць спектакль. Яна прадэманстравала мастацкаму кіраўніцтву тэатра, што з гэтай п'есы можа атрымацца паўнавартасны спектакль. Калі мы гаворым пра студэнтаў, якія прыходзяць і імкнуцца нешта рабіць, то ў іх усё робіцца на цікавасці. Яны нічога не просяць, акрамя магчымасці папрацаваць з тым ці іншым матэрыялам. Ёсць Таццяна Арцімовіч, якая будзе ўжо другі спектакль «Гаспадар кавярні» паказваць у «Графіці», на яго прадаюцца квіткі. Мы разумеем, што тэатральны працэс у Беларусі выходзіць за рамкі рэпертуарных тэатраў.

Дзеля таго, каб актывізаваць працэсы ў айчыннай драматургіі, была створана і Студыя альтэрнатыўнай драмы — аб'яднанне маладых драматургаў. З вынікамі працы гэтай супольнасці лепш за ўсё знаёміцца ў супольным праекце — так вырашылі драматургі. І ўтраіх — Дзмітрый Багаслаўскі, Віктар Красоўскі і Сяргей Анцалевіч — стварылі адну п'есу «Patris» у жанры дакументальнага тэатра, не вельмі распаўсюджанага цяпер у нашай краіне: «Каб беларускі глядач убачыў, дзе ён жыве». І самае дзіўнае — яны самі ж яе ставяць. Новы драматычны тэатр прадэманструе вынікі працы на фестывалі «Тэарт». Пра задачы нашага САДу **Дзмітрый Багаслаўскі** разважае так:

— Чаму мы гэта зрабілі? Таму што вельмі цяжка нам прабіць гэтую сцяну неразумення з боку беларускіх рэжысёраў. Таму вырашылі самі звярнуць на сябе ўвагу. І ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі мы сталі спачатку праводзіць чыткі нашых п'ес... Насамрэч тэатр адгукаецца на нейкія з'явы, факты з жыцця пераводзіць у факты мастацтва. Для мяне ў тэатры важна, каб гэта было шчыра. Калі гэта шчыра зрабіў рэжысёр, калі шчыра зрабіў артыст, то ў мяне не ўзнікае пытанняў.

Свой погляд на працэсы ў беларускім тэатры мае тэатральны крытык, прафесар **Таццяна Арлова:**

— Мне здаецца, што сёння ў сувязі з існаваннем фестывалю «Тэарт» адбываецца сур'ёзны прарыў. Як правіла, адбываецца так, што на любых міжнародных фестывалях заўсёды добра выглядаюць калектывы з Расіі і іншых краін, а Беларусь сціплая, талерантная, спакойная, не можа заявіць пра сябе сур'ёзнымі рэчамі. Зараз у беларускай драматургіі назіраюцца цікавыя працэсы. Аляксандр Марчанка праз супрацоўніцтва з Міжнароднай канфедэрацыяй тэатральных саюзаў зламаў гэтую сцяну. Сёлета ў фестывалі «Тэарт» 5 спектакляў паводле беларускай драматургіі!.. Хоць паўсюдна кажуць пра беларускую драматургію за межамі Беларусі. Не думаю, што пасля таго, як гэта адбудзецца, у нас усе адразу пачнуць ставіць спектаклі, беларускай драматургіі. Але сам факт, што мы заяўляем пра яе, — вельмі дарагі. Мы гаворым, што сённяшняя маладая драматургія — новая драма, якая выклікае шок. Гэта не зусім так. З першага знаёмства я, як крытык, улюбілася ў Дзіму Багаслаўскага. Ён унёс новую ноту ў гэтую плынь. Ён працягвае лепшыя традыцыі тэатра і раптам паказвае, як цікава гэта можна рабіць сучаснай мовай, сучаснымі формамі. Ёсць драматургія Дударава, Дзялендзіка, Петрашкевіча, а ёсць і тое, чаго патрабуе час. Гэта важна для тэатра, каб ён не сыходзіў у «забаўлялкі», у касавасць, якая сёння цісне. Для гэтага ёсць шоу-бізнес, нехай ён робіць сваю справу. Але ў тэатра вельмі цікавыя мэты, і мы не павінны ад іх адступаць, таму што трэба даследаваць душу чалавека, трэба пра яе гаварыць, каб мы не згубілі апошняе, што ў нас ёсць, — духоўнасць...

Ларыса ЦІМОШЫК
■

АДНЫМІ ГРАШЫМА ТУТ НЕ ДАПАМОЖАШ

Юрый Ігруша — кінапрадзюсар з 25-гадовым стажам. Ён стаяў каля вытокаў беларускага відэаарта ў канцы 1980-х, сябраваў з творцамі-авангардыстамі, якія сёння лічацца класікамі айчыннага мастацтва. Ён здымаў кіно, ствараў кінакааператывы, быў адным з аўтараў культавай тэлеперадачы пачатку 1990-х «Око» (якая пра рэкламу і не толькі) і знаходзіўся ў камандзе стваральнікаў тэлеканала АНТ. Апошнія два гады Юрый Віктаравіч узначальваў Беларускі відэацэнтр, які за гэты час са стратнага ператварыўся ў прыбытковае прадпрыемства і стаў для многіх знакам якасці. Праўда, нядаўна было прынята рашэнне далучыць Беларускі відэацэнтр да Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» у якасці студыі спецыяльных праектаў.
Пра гэта, а таксама пра глабальны кінабізнес, сусветны кінапракат, асаблівасці айчыннай кінаіндустрыі і прадзюсіравання і пра тое, чаму кіношнікі вымушаны не спаць суткамі, Юрый Ігруша распавёў адмыслова для «Звязды».

Юрый Ігруша на фестывалі «AVE» («Аўдыёвізуальны эксперымент») у Галандыі. 1989 год.

КІНО АРХІТЭКТАРА

— Па адукацыі я архітэктар, скончыў архітэктурны факультэт БНТУ. Калі прасачыць шляхі архітэктараў, часам здзіўляешся. У Беларусі, напрыклад, вядомы мультыплікатар Міхаіл Тумеля па адукацыі архітэктар. Мы разам вучыліся. Дзмітрый Строцаў, вядомы авангардны паэт, — таксама наш аднакурснік. Наш курс быў вельмі выбітным. З намі вучылася яшчэ Галіна Левіна, дачка Леаніда Левіна, вядомы архітэктар, якая ўзначальвае камісію ў Бруселі па захаванні культурнай спадчыны. Архітэктурны факультэт заўжды славіўся сваімі традыцыямі. Адна з галоўных — стварэнне аматарскага кіно. Нават спецыяльны «Архікінафестываль» праводзіўся ў Мінску на вуліцы Карла Маркса ў памяшканні Саюза архітэктараў. Гэта было культавае месца, куды людзі стараліся патрапіць усімі спосабамі. Лезлі нават праз вокны.

— На факультэце была група людзей, якая здымала на кінаплёнку 8 і 16 мм. Я далучыўся да гэтага працэсу, таму што любіў фатаграфаваць і ўжо здымаў на аматарскую кінакамеру. Мой пластылінавы мультфільм тых часоў пра ваенныя зборы нават заняў першае месца на «Архікінафестывалі». Такім чынам я прыйшоў да ўспрымання кіно, да першых эксперыментаў. Адчуў, што такое глядацкая ўвага. І неяк мяне гэта зачапіла.

— У 1985 годзе скончыў архітэктурны факультэт. Прычым дыплом быў сур'ёзны — «Узнаўленне гістарычнага архітэктурнага ядра горада Нясвіжа». Я правёў там шмат часу — у архівах, музеях, на раскопках. З тых часоў Нясвіж — адзін з маіх улюбёных гарадоў. І гэта нават адлюстравалася на працы Белвідэацэнтра. Мы зрабілі шэраг фільмаў пра Нясвіж. А мой дыплом заняў першае месца на конкурсе дыпломаў архітэктараў у СССР.

— У мяне было шмат сяброў, якія працавалі ў галіне кіно і тэлебачання. Яны ўбачылі, што я трохі засумаваў у Белдзяржпраекце, куды патрапіў па размеркаванні, і прапанавалі перайсці працаваць у кіно. Я стаў адным з самых маладых тарыфікаваных кінааператараў.

— Набліжалася перабудова. Мы з калегам аднойчы ўбачылі рэкламны буклет відэакамер. Разгледзелі яго з павелічальным шклом і зразумелі, што за гэтым будучыня. Пачынаўся рух кааператываў. Мы ўзялі крэдыт, паехалі ў Прыбалтыку, купілі відэакамеру, прывезлі яе ў Беларусь. І гэта была першая ў Беларусі відэакамера новага пакалення. Потым адкрылі першы ў Беларусі кінакааператыў — «Відэаатэлье №1». Пачалі выконваць заказное рэкламнае і прэзентацыйнае відэа.

ВЫТОКІ ПРАДЗЮСІРАВАННЯ

— Каб здымаць свае фільмы, даводзілася рабіць нейкія дапаможныя рэчы — зарабляць грошы. Паступова гэты працэс ператварыўся ў прафесію. Менавіта там і знаходзяцца вытокі прадзюсіравання. Трэба было самастойна шукаць крыніцы фінансавання, праходзіць увесь ланцужок ад пошуку грошай да выніковага прадукту. Я адкрыў кампанію «ОКО». Пачаў рабіць аднайменную праграму. Гэта была праграма пра рэкламу, якая ішла ў эфіры беларускага тэлебачання з 1989 па 1995 год і з'яўлялася аналагам расійскай перадачы «Рэктайм», якую вёў Ігар Вернік. Мы доўга шукалі вядучага, знайшлі маладога хлопца. Цяпер гэта вядомы акцёр Эдуард Трухмянёў. Потым яго замяніла Вольга Сарако.

— Аднойчы мы нават запрасілі «Рэктайм» у Беларусь. Яны знялі тут тры выпускі пра стан беларускай рэкламы і не толькі. Яшчэ там паказваліся найлепшыя рэкламныя ролікі свету. Так я выйшаў на «Ноч паглынальнікаў рэкламы». Першую і другую «Ноч» у Мінску праводзіў я. Пасля былі першыя «Канскія львы».

— Для сябе мы здымалі відэаарт. Абстрактныя канцэптуальныя фільмы. Многія з іх у мяне захаваліся. А ў 2000 годзе я зняў вялікі дакументальны фільм «Падземка». У яго ўвайшлі найлепшыя фрагменты тых старых фільмаў, а таксама інтэрв'ю з Цэслерам, Строцавым, Міцьком — вядомым мінскім персанажам Дзмітрыем Корзунам. Наогул, я хачу выпусціць анталогію рання га беларускага відэаарта.

КУЛЬТ МЕСЦА

— Тады было вельмі шмат мінскіх традыцый, якія мы самі стварылі. Былі штодзённыя сустрэчы на вуліцы Чырвонай у кавярні. Гэта было культавае месца, дзе сустракаліся ўсе авангардысты. У гадзіну дня на Чырвоную заўжды можна было прыйсці, і там нехта з нашых быў. Усе сустракаліся, абменьваліся інфармацыяй. Тады не было ні інтэрнэту, ні мабільных тэлефонаў. Але мы ведалі, дзе знайсці адно аднаго. У нашай тусоўцы былі Дзмітрый Строцаў з гуртом «Беларускі клімат», якія нядаўна ўжо юбілей адзначылі, Філіп Чмыр, вядомы ў Мінску як Філ, з гуртом «Барабанны экстаз», які потым стаў знакамітым «Drum Exstasy», і многія іншыя. Гэта былі часы, калі яны ладзілі канцэрты пад мастамі на Свіслачы, а іх за гэта арыштоўвалі. Усё было так эпатажна.

— Яшчэ адным культавым месцам было Траецкае прадмесце. Увечары ўсе збіраліся ў Траецкім. Тады актуальнымі станавіліся перформансы. Гэтым славіўся Ігар Кашкурэвіч, які цяпер жыве ў Германіі. Мы з ім знялі вельмі шмат відэаперформансаў, частка з іх захавалася. Напрыклад, быў перформанс да юбілея Малевіча. Стварылі супрэматычную труну, унеслі яе ноччу ў Палац мастацтваў. Было шыкоўна.

КІНО ЯК ТЭАТР

— У той перыяд з'явілася геніяльная задума гурта «Беларускі клімат» і Дзмітрыя Строцава «изустное кино», калі кіно стваралася без дапамогі кінаінструментаў: камеры, мантажу, экрана і г.д. Чалавек або некалькі людзей проста пераказвалі фільм. Тады прайшлі нават тры фестывалі такога кіно. Першы адбыўся ў пад'ездзе, як імправізацыя. А трэці прайшоў пры поўнай зале ў Палацы прафсаюзаў. «Изустное кино» сёння ўвайшло ў анталогію авангарду як беларускае вынаходніцтва. Гэта сусветная з'ява, якой не было нідзе. І гэта ўсё з'явілася з жадання здымаць кіно ва ўмовах, калі не было ні грошай, ні абсталявання.

ДЗЯРЖАЎНАЕ І ПРЫВАТНАЕ

— У эпоху першых камерцыйных банкаў, калі яны яшчэ фінансавалі кіно, было знята некалькі знакавых фільмаў. Сярод іх фільм Аляксандра Карпава «Мона Ліза». Там здымаўся Цэслер і шмат іншых цікавых людзей. Гэта адзін з такіх знакавых фільмаў перыяду кааператыўнага кіно. Але перыяд быў даволі кароткі. Узлёт камерцыйных банкаў, якія спрабавалі займацца ўсім: і гандляваць вагонамі, і здымаць кіно — хутка скончыўся.

— Потым зноў падключылася дзяржава і ўзмацніўся дзяржаўны сектар. У перабудову ў дзяржавы грошай на кіно практычна не было. Чаму банкі і пачалі яго падтрымліваць. Але дзяржава ўзнавіла фінансаванне. Ад гэтага, праўда, больш фільмаў не стала, але ўзмацнілася манаполія. Кіно — даволі дарагое мастацтва. Без грошай можна рабіць толькі эксперыментальныя незалежныя фільмы. На экране беднае кіно адразу заўважнае. Крыніцы фінансавання — гэта асноўны момант у кіно. У Беларусі ў асноўным развіваецца лінія дзяржаўнага кіно. Альбо мы аказваем паслугі расійскім тэле- і кінакампаніям. Сюды прыходзяць расійскія прадзюсары, наймаючы цэлыя беларускія здымачныя групы. Тадароўскі, Астрахан і вельмі шмат іншых вядомых рэжысёраў здымаюць кіно на тэрыторыі Беларусі. Гэта дазволіла развіць інфраструктуру. З'явіліся кампаніі, якія абслугоўваюць кіно: здаюць абсталяванне ў арэнду і набіраюць здымачныя групы. Апошнія гады былі сезоны, калі здымалася да 40 фільмаў на тэрыторыі Беларусі. Па-першае, гэта каласальны прыток сродкаў. Па-другое, праца для многіх беларускіх спецыялістаў, якія на кожным фільме ўсё больш адтачваюць сваё майстэрства.

— Калі ў сумесным праекце няма долі, якая набліжаецца да 50%, то ўдзел у ім з фінансавага пункту гледжання амаль не мае сэнсу. Я, як прадзюсар, заўжды імкнуся да ўдзелу ў тых праектах, якія пакідаюць долю ў фільме. Кропка акупнасці гэтых фільмаў павінна быць не вельмі далёкая. Чым даражэй праект, тым далей кропка яго акупнасці.

— У чым сёння праблема дзяржаўнага кіно? У тым, што няма скразнога прадзюсіравання, калі прадукт ад пачатку да канца знаходзіцца нібы ў адных руках. А ў нас як? Запусцілі фільм, засвоілі бюджэт, а далей хто фільмам займаецца — незразумела.

ГЛАБАЛЬНЫ КІНАБІЗНЕС

— Гульнявое кіно сёння мае вертыкальную амплітуду. Гэта значыць, самая высокая кропка продажу фільма — адразу пасля стварэння. А дакументальнае кіно мае гарызантальную амплітуду. Яно прадаецца ўвесь час, і бывае нават так: чым старэйшы фільм — тым ён цікавейшы становіцца.

— У заходнім кіно свая лагістыка. Калі кампанія створана магутным прадзюсарам, то яна робіць стаўку не на адзін фільм, а на пакет фільмаў, падразумяваючы адразу, што з іх толькі некалькі будуць камерцыйна паспяховымі і акупяць увесь пакет. Усё выходзіць з адной крыніцы, аптымізуе вытворчасць. Такім чынам адбываецца глабальны бізнес.

— Калі рабіць фільмы па адным, не падыходзячы да гэтага сістэмна, не прасоўваючы на рынак сваю прадукцыю пакетна, то ў розніцу кожны фільм практычна неакупны. Асабліва ў Беларусі, таму што ў нас няма добрай сістэмы кінатэатраў. На 10 мільёнаў чалавек у нас вельмі мала кінатэатраў. Да таго ж давер да беларускага кіно, на вялікі жаль, страчаны. Яго трэба вяртаць.

ПРАДЗЮСАР — ГЭТА ЦЭМЕНТ

— Школа прадзюсараў неабходная. Але прадзюсар — гэта вопыт, гэта цэмент, на якім трымаецца ўся кінавытворчасць. Нельга навучыць прадзюсіраванню маладога чалавека, які не ведае знутры нічога. Я не раз назіраў працэсы кінавытворчасці, дзе кіраўнікі нават не разумеюць, як што робіцца. Я працаваў на здымачнай пляцоўцы і ў мантажнай суткамі. Мой рэкорд працы, не выходзячы з мантажнай, чацвёра сутак. Я спаў, пакуль відэаінжынер рабіў падлікі. Потым ён мяне штурхаў, і я працаваў далей. Гэта было падчас працы над фільмам «З Новым годам, альбо Цягнік №1». Ён ствараўся кампаніяй «ОКО» па заказе беларускага тэлебачання. Там іграў Дзмітрый Харацьян, спявала Эдзіта П'еха і вельмі шмат сёння вельмі вядомых беларускіх гуртоў. Рэжысёрам фільма быў Уладзімір Янкоўскі, сын Расціслава Янкоўскага. На фінальных мантажах Валодзя захварэў, і мне, як прадзюсару, давялося заканчваць фільм самому. Гэта быў 2000 год. Фільм быў павінен ісці ў эфір адразу пасля навагодняга віншавання Прэзідэнта. Тэхніка адмаўлялася працаваць. Калі ў эфіры ўжо ішла першая частка фільма, трэцяя частка яшчэ толькі ехала на эфір. Я тады ўжо наогул ледзь стаяў на нагах. Мой калега Ваня Пінігін стаў на калені перад камп'ютарам і маліў яго, каб той запісаў фільм. Камп'ютар апошні раз уключыўся, запісаў усё і памёр канчаткова. «Круцейшага» моманту ў жыцці проста не было: магія поўная, энергетыка зашкальвала, нават «жалеза» не вытрымлівала.

— Адсюль вынікае галоўны прынцып працы прадзюсара — паднімацца і рабіць нават тады, калі рабіць не можа ўжо ніхто. І тут мне заўжды вельмі дапамагае вопыт і тое, што я ведаю ўсе працэсы знутры. Трэба разумець, што ў сучасным кінапрацэсе: няма прадзюсара — няма прадукту. І прадзюсар — гэта не той чалавек, які дае свае грошы, а той, хто іх знаходзіць з розных крыніц і звязвае рэсурсы з вынікам.

ТЭЛЕБАЧАННЕ ТВАЁЙ МАРЫ

— Калі з'явілася задума стварэння канала АНТ, яго ініцыятары запрасілі, на іх погляд, прафесіяналаў на рынку. Так я патрапіў у каманду людзей, якія прыдумлялі канцэпцыю канала з самага пачатку. Гэта быў вельмі цікавы час, мы ўсё рабілі ўпершыню. Тэлеканал у пэўным сэнсе зрабіў рэвалюцыю на тэлерынку Беларусі. Стварыў канкурэнцыю, увёў паняцце рэйтынга. Вельмі шмат рэчаў, якія сёння прысутнічаюць як данасць, тады спазнаваліся ўпершыню. Нават формы праграм, набыццё фармату. Я спецыяльна ездзіў у Швецыю вывучаць сістэму тэлефарматаў, таму што асноўны цэнтр гандлю тэлефарматамі знаходзіцца ў Стакгольме.

— На канале ў нас была задума фільма-катастрофы «Рэактар», прысвечанага чарнобыльскай катастрофе. Але паколькі задума была даволі глабальная, у 2005 годзе праект палічылі занадта дарагім і не запусцілі. Хаця ў нас была праведзена ўся падрыхтоўчая праца. Калі я зразумеў, што ад Беларусі стапрацэнтнага фінансавання не будзе, то правёў перамовы з Ігарам Таўстуновым (маскоўская кампанія «Профіт»). Ён загарэўся. Прайшло літаральна два тыдні, і я прачытаў у расійскай прэсе наступнае: маўляў, Ігар правёў прэс-канферэнцыю і заявіў, што да ўгодкаў чарнобыльскай катастрофы ў 2011 годзе будзе зняты фільм-катастрофа, папярэдне атрымана згода Фёдара Бандарчука і магчымы ўдзел Беларусі і Украіны. Хаця гэта, вядома, была наша ідэя. У выніку Ігар спрадзюсіраваў фільм-катастрофу «Метро», а яго партнёр, з якім яны не сышліся ў поглядах, фільм Аляксандра Мендадзэ «У суботу» — пра Чарнобыль. Вось так эвалюцыянуюць ідэі.

— Яшчэ адным знакавым праектам для мяне стаў фільм Сяргея Лазніцы «У тумане». Гэта я прывёў Сяргея ў Міністэрства культуры да тагачаснага міністра Паўла Латушкі і ў Дэпартамент па кінематаграфіі, які тады ўзначальваў сённяшні дырэктар «Беларусьфільма» Алег Сільвановіч. І хаця Лазніца першапачаткова не планаваў удзел Беларусі ў фільме, мы яго пераканалі, што Быкаў і Беларусь — непадзельныя.

— Калі я чую «Якая там роля Беларусі ў фільме «У тумане»!, мне трошкі смешна. Калі мы з галоўным прадзюсарам фільма немцам Хайнам Дэкертам ішлі па чырвоным дыванку Канскага кінафестываля, ён сказаў мне, што без беларусаў фільм не выйшаў бы. Быў пэўны момант з-за нястачы фінансавання, калі вырашалася пытанне аб замарозцы фільма на год. Гэта азначала — смерць. І менавіта рашэнне беларусаў экспартаваць за мяжу шэраг сваіх паслуг, рэквізіту, касцюмаў, людзей вырашыла лёс фільма.

УНІКАЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

— Калі Павел Латушка, які зараз з'яўляецца паслом Беларусі ў Францыі, прапанаваў мне ў перыяд працы на праекце Сяргея Лазніцы пасаду дырэктара Беларускага відэацэнтра, я пагадзіўся. На той момант Белвідэацэнтр быў стратнай кампаніяй, але актыўна ішло рэфармаванне кіно, я адчуваў падтрымку дзяржавы і Мінкульта. Вывеў прадпрыемства са страт, рэарганізаваў кампанію і, па сутнасці, стварыў прадзюсарскі цэнтр унутры маленькай дзяржаўнай структуры. І калі раней было вельмі складана знайсці рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў, то пасля ўвядзення дагаворнай сістэмы супрацоўніцтва ў нас утварылася літаральна чарга спецыялістаў, якія хочуць з намі працаваць.

— За два гады працы мы зняслі 78 фільмаў, узялі ўдзел у 176 фестывалях і больш чым у 50 атрымалі ўзнагароды. З пункту гледжання бізнесу, фестывалі патрэбныя для таго, каб павысіць кошт фільма. Мы стварылі свой каляндар фестываляў і наладзілі сістэму пастаяннга ўдзелу ў іх. Пасля ўсіх гэтых поспехаў для мяне рашэнне аб далучэнні Белвідэацэнтра да кінастудыі «Беларусьфільм» усё яшчэ застаецца загадкай. На мой погляд, узбуйняць і так грувасткую кінастудыю — няправільны шлях. Тым больш што здаровая канкурэнцыя прыносіць толькі карысць.

— У беларускай сістэме кінавытворчасці павінен выпрацавацца свой шлях. Глабалізацыя праектаў для Беларусі — памылка. Сёння нам не дагнаць сусветную кінавытворчасць, дзе бюджэты фільмаў велізарныя. Тым больш што хутка бюджэт фільма ў 200 мільёнаў долараў і больш стане проста неакупным. Беларусь на гэтым фоне выглядае смешна. А вось невялікія фарматы або малабюджэтныя поўныя метры, заснаваныя на цікавай ідэі, з добрай рэжысурай і акцёрамі, могуць нас ратаваць. Гэта шлях пошуку драматычнай лініі, а не экшну. Таму павялічваюцца функцыі рэжысёра, сцэнарыстаў, аператараў, то пасля ўвядзення дагаворнай сістэмы супрацоўніцтва ў нас утварылася літаральна чарга спецыялістаў, якія хочуць з намі працаваць.

— Думаю, сёння для Беларусі вельмі важна падтрымаць кірунак незалежнага (з пункту гледжання крыніц фінансавання) аўтарскага кіно. Таму адным з кірункаў кампаніі «Адкрытае кіно», дзе я з'яўляюся супрадзюсарам, будзе якраз падтрымка невялікіх артавых праектаў. З намі падпісалі кантракты ўжо многія беларускія рэжысёры: Арцём Лобач, Максім Носаў, Юрый Елхаў ды іншыя. Мы адкрыты для супрацоўніцтва. Наша галоўная мэта — не даць маладым пасля здымкаў першага фільма расчаравацца і сысці з прафесіі. Мы будзем дапамагаць шукаць фінансаванне, наладжваць дыстрыбуцыю. Акрамя таго, я працягну працу над праектам «Брут» (другі фільм пасля стужкі «Туфлікі» для кінаальманаха пра Халакост) з рэжысёрам Канстанцінам Фамам. Паклікалі мяне і прадзюсіраваць новы нацыянальны кінапраект — хутка вы пра яго пачуеце. Ёсць сумесныя планы ў нас і з Хайнам Дэкертам. З адным з беларускіх тэлеканалаў вяду перамовы пра стварэнне штотыднёвай праграмы пра незалежнае беларускае кіно. Праца працягваецца. Усё па-ранейшаму.

Гутарыла Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ
■

■ На свае вочы

ЧАТЫРЫ ЎРАЖАННІ

БЯЛГРАД — НАТУРАЛЬНАСЦЬ І ШЧЫРАСЦЬ БАЧЫЦЦА ВА ЎСІМ. ПРАГА — ДЗІЎНАЯ, А ЧАСАМ І НЕБЯСПЕЧНАЯ. ВЕНА — ГОРАД, ДЗЕ ПАЎСЮЛЬ ТОЛЬКІ СПЕКУЛЮЮЦЬ НА БЫЛОЙ ВЕЛІЧЫ ІМПЕРЫІ. БУДАПЕШТ — ДЗВЕ ДУШЫ І ШМАТГРАННАСЦЬ ХАРАКТАРУ

Сонейка, якое так спальвала ў Празе, надакучвала ў Вене і расслабляла ў Будапешце, тут перастала быць нясцерпным і прыемна абагравала — мяккае, лагоднае, зусім бесклапотнае, затуманенае пяшчотай летняга працяглага захаду, але не лянівае — жывое і радаснае. Можа быць, яно падалося мне такім з-за ўсмешкі таго хлопца, што падышоў да нас каля храма святога Савы (першы сербскі архіепіскап і нацыянальны герой, ахоўнік краіны), каб запрасіць на дабрачынны канцэрт. Малады серб нічога не патрабаваў ад нас. Даведаўшыся, што мы турысты і хутка паедзем, прапанаваў набыць паштоўку. Мы выйгралі выяву вячэрняга Бялграда і, думаю, атрымалі самы лепшы сувенір, які толькі можна было прывезці з сербскай сталіцы, — адчуванне пяшчоты і дабрыні.

СЕРБІЯ


Храм святога Савы ў Бялградзе.

Яно там паўсюль. У тварах і рухах жыхароў, у вулачках і паркавых алеях. Нават у сценах старой крэпасці. Сонейка і не магло там быць іншым, акрамя як вытанчана-лагодным. Узнёсласць і спакой, якія ахутвалі нас у самім Бялградзе і пэўны час пасля яго наведвання, не зруйнавалі нават «жывыя» помнікі вайны 1999 года — разбураныя і аголеныя бамбёжкамі авіяцыі НАТА пабудовы, некаторыя з якіх сербы спецыяльна не рэканструявалі. Усё гэта толькі дадало пачуцця гонару за народ, які, не зважаючы ні на што, застаецца чалавечным і адкрытым.

Знаходзячыся на сербскай зямлі, вы ніколі не падумаеце, што ў краіны вялікія эканамічныя праблемы. Гаспадарка дагэтуль не можа цалкам аднавіцца пасля хаця і не працяглай (78 дзён), але разбуральнай вайны. У Бялградзе цяжка знайсці працу. Але людзі адтуль не з'язджаюць. Жывуць хоць неяк і не скардзяцца. І я іх разумею. Самому захацелася там застацца. Горад з непаўторнай атмасферай, нейкі такі ўвесь утульны. Ты адчуваеш сябе як дома. Быццам і нарадзіўся там, і жыццё пражыў. «Горад для людзей...» — паўтаралі нам. І яно сапраўды так. Шмат паркаў, дзе жыхары проста шпацыруюць ці сядзяць на лавачках, а можа, і гуляюць у шахматы за спецыяльнымі столікамі. Прыемны дзіцячы віск і смех — пастаянны фон для ўсяго, што адбываецца. Замест страшэнных вялізных атракцыёнаў звычайныя дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі ў любым зручным месцы — нават каля крапасных сцен. Там не думаюць аб выгадзе ці прэстыжы. Там думаюць аб людзях — абы толькі ім было зручна і спакойна.

Ніхто не хоча падацца лепшым, чым ён ёсць. Натуральнасць і шчырасць бачыцца ва ўсім. Людзі выходзяць на вуліцу, каб адпачыць, пагутарыць са знаёмымі ці пазаймацца спортам, але ні ў якім разе не для таго, каб «паказаць сябе». Адсутнасць гэтай невыноснай «паказушнасці», відаць, і прываблівае мяне больш за ўсё ў цудоўнай краіне. Не кожная нацыя сёння знаходзіць смеласць для такіх паводзін. Ці трэба казаць, што мне хочацца абавязкова туды вярнуцца?

ЧЭХІЯ

Пяройдзем да храналагічнага парадку вандроўкі. Пачалося ўсё з Чэхіі, якая сустрэла нас знаёмымі словамі, сэнс якіх для беларуса незвычайны. Думаю, шмат хто чуў пра тое, што ў чэхаў шмат сэнсавых перавёртышаў — інакш кажучы, гучаць словы аднолькава, але сэнс маюць супрацьлеглы. У крамах можна было спакойна купіць чэрствы (насамрэч свежы) хлеб ці панюхаць ваніяўкі (насамрэч духі), а на вуліцах убачыць жахлівых дзяўчат (па-руску «ужасных», што насамрэч значыць «цудоўных»).

Аднак неспадзяванкі на гэтым не скончыліся. Пасля доўгай, цікавай, але вельмі стамляльнай экскурсіі па Празе апетыт разгуляўся не на жарт. Зразумела, што ўвечары проста беглі ў рэстаран. Па-першае, хацелася паспрабаваць знакамітае чэшскае піва, а па-другое, нарэшце паесці. Дзякуй Богу, што здагадаліся заказваць ежу адной порцыяй на дваіх. Ужо пасля велічэзнай талеркі смачнага супу-пюрэ можна было і скончыць трапезу. Але тут нам з жонкай прынеслі салату. У меню было пазначана: «Салата... з кавалачкамі курыцы». Бачылі б вы тыя «кавалачкі»! Не схлушу, калі скажу, што гэта былі дзве вялікія адбіўныя.

Знакаміты танцуючы дом у Празе.

Тут нам стала страшна, бо «на гарачае» мы заказалі рабрынкі, а на тое, што страва важыць 900 грамаў, неяк не звярнулі ўвагі. Думалі, што будзе як у нашых рэстаранах... Памыліліся. Адным словам, ледзь з'елі. Вельмі дапамагло насамрэч смачнае, мяккае і прыемнае чэшскае піва. Добра, што яшчэ не ўзялі легендарнае «вяпрукова калена» (па-нашаму проста рулька). Даю параду тым, хто будзе ў Чэхіі, ды ўвогуле амаль у любой еўрапейскай краіне: не заказвайце шмат, бо порцыі вельмі вялікія. Мой знаёмы з Прагі (з якім я, зразумела, сустрэўся, аказаўшыся ў чэшскай сталіцы) пасля пасмяяўся з мяне і сказаў: «Мы заўсёды заказваем што-небудзь адно — ці салату, ці суп. Гэтага хапае».

Толькі не думайце, што Прага мне запомнілася выключна ежай. Не. Гэта сапраўды цудоўны горад. Прыгожы, але занадта перапоўнены турыстамі. Каралеўскія палацы і паркі, вузкія гарадскія вулачкі — усё гэта, безумоўна, прыцягвае. Адно толькі, што цяжка на вуліцы чэха сустрэць — паўсюль разнамоўныя гіды са стракатымі турыстычнымі групамі. Кажуць нават, што адна немаленькая (мякка кажучы) амерыканка засела паміж дзвюма сценамі на самай вузкай у Еўропе вуліцы, якая рэгулюецца святлафорам (сантыметраў 60-70 у шырыню). Каб выцягнуць яе, спатрэбілася дапамога выратавальнікаў. Вось такая яна дзіўная, а часам і небяспечная Прага.

АЎСТРЫЯ

Велічныя збудаванні часоў Аўстра-Венгерскай імперыі спачатку ўражвалі. Але вельмі хутка Вена стала для мяне адным суцэльным расчараваннем. Не ведаю, чаму сталіцу Аўстрыі называюць «горадам закаханых». Сапраўды, там ёсць на што паглядзець. Але асаблівай рамантыкі ў горадзе не адчуваецца: прыгожая архітэктура нівеліруецца суцэльным засіллем шматлікіх крамак і магазінаў. Забіты гандлем дух рамантыкі, якім сапраўды быў напоўнены горад раней, застаўся, відаць, толькі на шматлікіх паштоўках і сувенірах з выявай любімай імператрыцы Елізаветы Баварскай. Sissi (так называлі яе родныя і сябры) разам са сваім каханым мужам, імператарам Францам Іосіфам I засталася ў сусветнай гісторыі не толькі як аб'яднальнікі Аўстрыі і Венгрыі, але і як самая рамантычная пара блакітнай крыві.

А сёння Вена — горад, дзе паўсюль толькі спекулююць на былой велічы імперыі. Ды нават на фашысцкім мінулым спрабуюць зарабіць: маю на ўвазе шматлікія антыкварныя крамы, дзе прадаюць розныя рэчы, якія некалі паадбіралі немцы ў яўрэяў. Зразумела, што, хто ведае, туды ніколі не заходзіць. Таму і закрываюцца паціху тыя крамы.

На вуліцы вы амаль не сустрэнеце аўстрыйцаў. Тым больш вы іх не ўбачыце сярод гандляроў, афіцыянтаў і гэтак далей. Гэтыя месцы заняты эмігрантамі з розных краін. Аўстрыйцы альбо папіваюць знакамітую венскую каву ў рэстаранчыках (бо можна без асаблівага напружвання жыць на сацыяльныя дапамогі ад дзяржавы), альбо заняты менш пыльнай працай з усімі сацыяльнымі гарантыямі. Горад дарагі. Заробкі там вялікія. Але эмігранты, якія пражывуць там хоць палову жыцця, ніколі не будуць прызнаны «за сваіх» і могуць у выніку нават на мізэрную пенсію не напрацаваць. Аднак гэта не ўчора і не пазаўчора такая сітуацыя намаляваласа. Тое цягнецца здавён. Самі аўстрыйцы ніколі нічога не рабілі — толькі карысталіся. Аб гэтым нам расказала гід, якая сама жыве там ужо 30 гадоў. Яе дарослы сын не захацеў застацца ў гэтай краіне, знайшоў сабе нявесту ў Расіі і вярнуўся на радзіму. А жанчына, вядома ж, не можа пакінуць свайго мужа-аўстрыйца...

Знешняя прыгажосць Вены.

Дарэчы, у цэнтры горада, у дамах старой пабудовы, дзе кватэры вельмі вялікія і дарагія, людзі жывуць без вады і прыбіральні. Ваду можна ўзяць толькі ўнізе, у пад'ездзе, з краніка ад крыніцы (у Вене паўсюль такія, нават на вуліцах — можна проста падыходзіць да аўтаматаў і набіраць чысцюткую ваду ды піць). Прыбіральня таксама агульная. Але жыхары згаджаюцца на гэта з-за шыкоўных кватэр.

Яшчэ адным расчараваннем была для мяне адсутнасць павагі да Моцарта, які жыў і пісаў музыку менавіта ў Вене. Ён глядзеў на нас са шматлікіх сувеніраў: парасонаў, паштовак, магніцікаў, бірулек, нават знакамітых (і вельмі дарагіх) цукерак. Але адшукаць, напрыклад, дыск з яго музыкай ці што-небудзь падобнага кшталту амаль немагчыма. Я ўжо не кажу пра тое, каб наведаць невялічкі канцэрт. Не, зразумела, можна схадзіць у оперны тэатр, але ж страшна падумаць, колькі гэта будзе каштаваць. Ды чаго тут разважаць, калі самы вядомы помнік геніяльнаму кампазітару стаіць наводшыбе былога імперскага саду Бурггартэн, і турыстычныя групы туды нават не заводзяць. Нам толькі сказалі, што можна туды пайсці, што мы, зразумела, і зрабілі ў вольны час.

ВЕНГРЫЯ

Будапешт, як дзяўчына, прыгожы і ўдзень, і ўначы. Не, ну сапраўды немагчыма вызначыць, калі венгерская сталіца падабаецца больш: у спякотны дзень, калі здаецца, што ўсё вакол абцягнута нейкім дымам ці туманам, а насамрэч цябе проста бесперапынку слепіць сонца; ці ўначы, калі ты плывеш па Дунаі на караблі і мутная, цёмная, амаль чорная вада гіпнатызуе цябе ды не дае спакойна атрымліваць асалоду ад начных краявідаў горада, адпачываючы пад халаднаватым пасля спёкі ветрыкам.

Буда і Пешт шмат гадоў былі асобнымі гарадамі. І толькі ў XIX стагоддзі іх аб'ядналі ў адзіны Будапешт. Але так і засталося ў горада дзве душы. Не, нават тры, бо яшчэ была Обуда (гэта значыць, старая Буда). Дарэчы, яшчэ адно цікавае падабенства ў параўнанні з дзяўчынай — шматграннасць характару... Будайскія горы і пешцкая раўніна разам утвараюць прыгожае спалучэнне не толькі прыроды, але і гістарычных эпох. Напэўна, заўсёды будзе немагчыма да канца высветліць усе архітэктурныя стылі і кірункі, якія выкарыстоўваліся ў забудове горада, бо яны тут набывалі адразу нейкае сваё аблічча, не падобнае ні на што, узведзенае дагэтуль. Напрыклад, Рыбацкі бастыён, створаны ў неараманскім стылі, хутчэй, нагадвае ўмацаванні і ўпрыгажэнні якога-небудзь усходняга палаца. Але, можа быць, я проста не вельмі дасведчаны ў тонкасцях архітэктуры. У любым выпадку, я здольны ацаніць прыгажосць будынка венгерскага парламента — адначасова велізарнага і лёгкага, як любая готыка. Асабліва цудоўна ён выглядае ў начной падсветцы.

Рыбацкі бастыён. Будапешт.

Але знакаміты венгерскі парламент не толькі сваім будынкам (палова якога, між іншым, здаецца ў арэнду для канферэнцый, бо некалі парламент быў двухпалатным, а цяпер другая частка не выкарыстоўваецца па прызначэнні). Ледзь не нацыянальным бедствам з'яўляецца колькасць дэпутатаў заканадаўчага органа — 386. Гэта пры тым, што колькасць насельніцтва прыкладна роўная адпаведнай беларускай лічбе — каля 10 мільёнаў чалавек (для параўнання: у нашым Нацыянальным сходзе 174 члены). І амаль чатыры сотні венграў, часцей за ўсё, не могуць ні аб чым дамовіцца. Відаць, менталітэт такі...

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.

Мінск — Прага — Вена — Будапешт — Бялград — Мінск

■ Простая мова

ХАЧУ НА МОРА ГЭТЫМ ЛЕТАМ...

У мяне завядзёнка такая — кожнае лета хацець на мора... А ў той год — дык нават пабываць: летам, на Чорным!
Што казаць — адвялі душу: накупаліся тады ў пяшчотнай празрыстай вадзе, нагрэліся пад ласкавым паўднёвым сонейкам, напіліся, наеліся рознай смакаты і ўбачылі столькі хараства...
— Ведаеш, чаго я зараз хачу? — на адвітанні з морам спытала сяброўка. — Прывезці сюды маму — хоць на тыдзень, хоць раз у жыцці...
Мары, як вядома, збываюцца і... не збываюцца: на вось гэту — не было то грошай, то часу, а потым...
Потым мама перанесла інсульт.
Гэта — жарт: «Хачу на мора гэтым летам...».
Не ў мяне адной завядзёнка такая — кожнае лета хацець на мора.

Пералом

На працу ў той ранак Ваня паехаў сам, а вось адтуль яго ўжо забралі: на «хуткай», без рукі — так званая вытворчая траўма.

Напакутаваўся, бедны... Але ж — дзякаваць Богу і сваёй сям'і — «ласты не склеіў»: навучыўся (адной левай!) есці варыць, дровы секчы, потым машыну вадзіць — сваю... А ўжо далей болей — стаў рамантаваць чужыя. І, можна сказаць, аджыў... Але тут палавіне яго не пашчасціла: нагу зламала...

Надоечы мы званілі ёй — на мабільны. Спыталі найперш, ці не перашкодзілі, ці можа яна размаўляць?

— А як жа! Магу, — узрадавалася жанчына. — Хоць мы тут з мужам цяпер. У краме... Прадукты на тыдзень купляем, а заадно — людзей весялім.

Уявілі, як яны, напару (ён з пустым рукавом, яна ў гіпсе і на мыліцах) ходзяць па гандлёвай зале, як перад імі паважліва расступаецца народ, з якой цікавасцю пазірае. Бо пара — сапраўды нечаканая, сапраўды... прыгожая...

І хто б гэта бачыў, калі б... не пераломы?

Быў бы куст...

Сяброўка непадалёку жыве. Што, вядома ж, добра — нейкіх дзесяць хвілін язды. А калі і тралейбус якраз...

— Тут затор, тут такі затор! — гэта першае, што чую, зайшоўшы. — Я сёння да вечара, мусіць, не даеду! Не ведаю, чаму... Можа, аварыя дзе. Але ж стаім! Глуха, — па мабільным «рапартуе» камусь адна з пасажырак.

«Рапартуе», як нанятая: вельмі смела, гучна...

Ад чаго, як той казаў, розум кірэчыцца, бо толькі сляпы не бачыць, што тралейбус едзе.

У бок дзяўчыны, што вось гэтак нахабна хлусіць, пазіраюць ці не ўсе пасажыры.

Што яна? Не, не бянтэжыцца, не камплексуе — і ў думках не мае! Яна ліха падманвае далей.

— Во дае! — захапляюцца дзяды з пярэдняй пляцоўкі. — І маладая ж зусім... І недзе ж працуе... І нехта ж яе навучыў...

Сумесная выснова: «настаўнікаў» тых цяпер больш чым дастаткова. Ды і ў працоўных месцах недахопу няма: быў бы куст, як той казаў, а варона знойдзецца.

Маладзіца... Як брусніца?

Падчас вучобы ў інстытуце ў іх дружная група была — пераважна з дзяўчат. Можа, таму і не пагубляліся: хоць зрэдчас, але пісалі адна адной, віншавалі са святамі, тэлефанавалі і нават сустракаліся. Надоечы — з добрай нагоды: 60 гадоў пасля заканчэння вучобы.

— Нас восем чалавек прыехала... Можа, у апошні раз ужо, — уздыхала адна з выпускніц. — Бо чаго ж хацець — узрост... Я там, ці не самай маладой выглядала, бо без кіечка яшчэ. Ён жа найбольш гады выдае?.. А слепаватасць ды глухаватасць маю ніхто і не заўважыў!

Пры ўсім багацці выбару...

Іронія лёсу: з некім звядзе, потым развядзе, «пажартуе» зноў...

— Зойка, Зоечка ты?! — крычыць нейкая кабета.

Крычыць — на задняй пляцоўцы аўтобуса. Каму — не відаць (народу шмат), затое чуваць, што называецца, за вярсту...

— Што — не пазнаеш? А я дык цябе адразу!.. Памяць у мяне — ого-го! Ну як ты?

Мяркуючы па паўзах, тая Зоечка нешта адказвае — хоць і коратка, але што — не чуваць. Затое суразмоўніцу яе — каб нават не хацеў...

— А працуеш, працуеш дзе? На трактарным? — гэтак жа гучна пытае яна. — І замужам? За тым самым? А дзеці, дзеці ў вас якія?..

У салоне зноў павісае паўза (мусіць, на кароткі адказ?), пасля якога звініць не толькі па-ранейшаму гучнае, але і абуранае ўжо:

— Як гэта няма?! Дзяцей няма?! Ну ты даеш?.. Во дурніца... Чаму? Цяпер жа столькі магчымасцяў...

Голас заглушае бразгат дзвярэй: аўтобус спыняецца на чарговым прыпынку, некага з пасажыраў выпускае (магчыма, Зоечку?), некага падбірае — едзе далей. І ў напружанай цішыні, як падалося, вязе ці не відавочнае: для таго, каб паразумнець, каб займець хоць трохі такту і далікатнасці, магчымасцяў цяпер не менш — кнігі, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт...

Шкада, што карыстаюцца імі далёка не ўсе. Нават — з цудоўнай памяццю.

Затое весялей!

Браць кватарантаў баба Аня не думала — ні ў якім разе! Казала (і мела ж рацыю?), што цяпер нават родныя — маці з дачкой — і то не ўжываюцца, а ўжо чужынцы... Бронь Божа!

Аднак... Хто знае, што каго чакае? Да старых бабы Аніных хвароб прычапіліся новыя, і без лекаў з імі ніяк... Да таго ж зняць пакойчык — на тры месяцы, за добрыя грошы — прасіўся не нехта там з вуліцы, а добры знаёмец — сын найлепшай сяброўкі.

Не ўстаяла бабуля — згадзілася прытуліць. І назаўтра ж (з дзявочай памяці ды ў старэчы склероз)... забылася. Літаральна: гэта значыць, сонейка прыпякло, — яна ўсё лішняе скінула і галяком, лічы, па кватэры... Яшчэ і з песняю. А тут — дзверы адчыняюцца...

Так што гаспадыня ведае цяпер (і дакладна!): разам з кватарантам жыць, вядома ж, не лепш. З ім — значна весялей.

Па кропельцы — рэчка...

Жнівень, спёка — дзверы ў крамах расчынены... Ад чаго гэта, невялічкая, здалёк яшчэ бабіць пахамі — свежай выпечкі, кавы...

Піць яе мы збіраемся дома — пірожныя бяром з сабой, вядома ж, заплаціўшы — за ўсе дзевяць...

А сталі выкладваць на талеркі — аднаго не далічыліся.

Мусіць, памыліліся ў краме, ці...

Стары анекдот: прадаўшчыца Лена свой першы мільён зарабіла дзякуючы фразе: «Дзесяць рублёў буду вам вінавата».

З людзьмі...

У Яўгенавіча падстаў для гонару, ці не сто, а вось яго самога — ні на грам. З усімі ён папросту: у таго пра здароўе спытае, у таго — пра дзяцей; з некім пажартуе, некага на працу ці з працы падвязе... Хоць на службовай машыне, хоць на сваёй...

Што не ўсе разумеюць.

Надоечы свайго калегу здзівіў. Той на прадпрыемства з новым праектам прыехаў — круты-круты, пальцы ўроскідку... Пакуль перамовы вялі, — час абеду настаў.

— Тут паблізу рэстаран ёсць. Я пазваню, каб нам столік накрылі. Разам паабедаем, — вырашыў госць.

— Не, дзякуй, — адмовіўся гаспадар, — я ў сваёй сталоўцы палуднаваць прывык.

— І што там можна есці?

— Чаму ж не? Айда за кампанію!..

Пакуль ішлі туды, з некім павіталіся-парукаліся, з некім паразмаўлялі, пастаялі ў чарзе...

І ўжо ў ёй госця як падмянілі! Казаў, гадоў 30 скінуў: як быццам у студэнцкую сталоўку патрапіў — з раздачай, з падносамі, з салатай са свежай капусты, з коржыкам... Шчаслівы быў, як дзіця!

Падалося, хоць у людзі і выбіўся, — чалавекам застаўся.

Зух — супраць мух...

Ёсць спадніцы максі, ёсць мідзі, ёсць міні... У дзеўкі, што крочыла наперадзе, — усё змяшалася, як той казаў: гэта значыць, левае сцягно ніжэй калена было закрыта нейкай лёгкай тканінкай, затое правае... голае — ну зусім. Без люстэрка і спехам, відаць, прыбіралася... А вось ідзе — памалу, быццам на шпацыр.

Прыйшлося дагнаць і, параўняўшыся, ціха заўважыць:

— Прабачце, у вас спаднічка задралася...

Нос у дзеўкі задраўся раней — адным знішчальным позіркам яна сказала: «Цемра егіпецкая, ну што ты разумееш!..». А ўголас яшчэ і дадала:

— Гэта фасон такі: злева — даўжэй, справа — карацей. Так задумана...

— Каб, — удакладніла, — бялізна віднелася?

Пасля гэтага дзеўка, падобна азірнулася, бо ўслед спалохана прамармытала:

— Ой, як жа!.. Прабачце... Дзякуй...

Яны, гэтыя словы, былі, вядома ж, не лішнія: добра, што сказала. Але ж куды лепш было б, кабяна яшчэ і зразумела, што пагарда чалавеку пасуе прыкладна гэтак жа, як... задраная спадніца.

«Канцэрт»

Святлана — добрая душа. Шмат гадоў дапамагала адной адзінокай бабулі, а калі той не стала, — шэфства ўзяла над другой. Гэта няцяжка: па магчымасці, зайсці, нечым пачаставаць, занесці цікавую кніжку, пагаварыць — распытаць (як у той раз, прынамсі), можа, спаць яна лепей стала, можа, у вушах больш не звініць?

— Звініць... Бывае, — скардзіцца бабуля. — І хай бы ж розныя мелодыі там былі, а то адна і тая ж, адна і тая ж! Дурны канцэрт...

На жаль — не па заяўках...

За што змагаўся?

...Дзяўчына была маладая і вельмі прыгожая — ад кавалераў адбою не мела. Ды і жаданняадбівацца. Які ў тым сэнс па цяперашнім часе? Справа ж маладая: з адным нейкі час пажыла, потым — з другім, з трэцім... Пакуль неспадзеўкі не зацяжарала ад чацвёртага, пакуль не нарадзіла малое, не ўзялася гадаваць. Рабіць гэта — адной, без мужа, было вельмі цяжка, а ўжо без грошай яго — немагчыма наогул!

Выйсця не мела — пайшла спаганяць аліменты. Думала — не будзе вялікіх складанасцяў!.. Як бы не так: судзіцца прыйшлося, двойчы генетычную экспертызу рабіць (першай так званы бацька веры не даў)... Ды і пасля другой у жыцці маладзіцы нямшат што змянілася, бо на дзіця сталі прыходзіць не грошы — вартыя жалю капейкі.

Як ні крыўдна было, з гэтым яна змірылася...

З чым не змірыцца — аніколі ў жыцці! — дык гэта з тым, што дзіцятка яе — такое харошае, такое разумнае, такое любімае... загінула! Загінула раптоўна, недарэчна, трагічна...

На пахаванне (гэта ж гора якое!) уся акруга сышлася...

І бацька прыехаў...

Адны казалі, што плакаў ён і дзіця сваё шчыра шкадаваў. Другія — што прыязджаў упэўніцца: аліменты больш плаціць не трэба.

Двое

Жнівень, горад, вуліца... Зранку яна — амаль пустая. Хіба двое насустрач: на тварах «напісана» — маці і сын.

— Вы не ведаеце, дом нумар 17 — гэта дзе? — пытае яна.

Не ведаю, а падмагчы хачу. Таму на ўсякі выпадак цікаўлюся: а што ў тым доме?

— Ды каледж... Як па-ранейшаму — тэхнікум, — тлумачыць жанчына і, падняўшы позірк на хлопца, дадае: — Сын во — паступае, прафесію хоча мець...

Малайчына — нічога не скажаш! І не кажу: тлумачу, дзе знаходзіцца тая ўстанова, як карацей прайсці.

Жанчына ўважліва слухае, хлопец... Хлопец, што называецца, ловіць варон: пазірае на дарогу, на машыны:

— Глянь, — тузае за рукаў матулю, — «смарцік» які...

— Вырас, а дзіця дзіцём, — усміхаецца яна і досыць строга дадае: — Ты лепш бы слухаў, дарогу запамінаў! Без мяне ж хадзіць давядзецца...

— Давядзецца — пайду, — незадаволена бурчыць юнак...

А пакуль яны (маці — на галаву ніжэйшая за сына і сынок — на тую ж галаву вышэйшы, але «дзіця дзіцём») ідуць побач...

Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж... Кніжка абразкоў «Каб сказаць... І пачулі» ў кнігарнях яшчэ прадаецца. Пытайцеся.

■ Нефармат

ГОРАД, ДЗЕ БУДУЦЬ ЛЮБІЦЬ ПРОСТА ТАК

Застаецца нейкі тыдзень да чарговага тэатральнага фестывалю ў Брэсце. Аматары мастацтва Мельпамены на форумах гадаюць, чым нас парадуюць на гэты раз і ці парадуюць наогул. А ў маім стале назапасілася цэлая шуфляда буклетаў з праграмамі і анонсамі кожнага фэсту за апошнія паўтара дзясятка гадоў.

Калі выпадае мінута, люблю іх праглядаць, успамінаць нейкія спектаклі, што пакінулі след у душы. Бывае добры, а бывае і такі, як спектакль «Скандал з публікай». Адзін эксперыментальны тэатр суседняй дзяржавы падкінуў памяркоўнай брэсцкай публіцы такі сюрпрыз. Быў задуманы сапраўдны скандал, правакацыя: артысты лаяліся, абзывалі гледачоў апошнімі словамі, імкнучыся выклікаць зваротную рэакцыю. Нашы людзі некаторы час былі ў лёгкім шоку, а потым адзін за адным сталі пакідаць залу. Самі ж кіраўнікі трупы патлумачылі, што гэта як паказ высокай моды: усе разумеюць, што з касмічнымі антэнамі на галаве нікуды не пойдзеш, але як мадэрнісцкая тэндэнцыя такі аксесуар можа быць. Ну і няхай будзе, асабліва калі нехта за гэта згодны плаціць.

І ўсё ж тэатр, па маім разуменні, там, дзе здолелі зачапіць за жывое, дзе кранулі душу, а не абмацюкалі са сцэны. Перагортваючы старонкі буклетаў, натыкаюся на спектакль «На дне» з маімі ўласнымі нататкамі на палях. Альбом 2006 года. Няўжо сем гадоў прайшло?! Бо помніцца, нібы справа была мінулай восенню. Спектакль па матывах п'есы Горкага прывёз Невялікі драматычны тэатр Льва Эрэнбурга з Санкт-Пецярбурга. У ацэнках яго і крытыкі, і гледачы падзяліліся на два процілеглыя лагеры: з аднаго боку, захапленне, з другога — жорсткае непрыманне. Затое абыякавых не засталося. Іх і не магло быць. Маладыя піцерцы паказалі сапраўдны тэатр. Яны былі адзінай камандай на сцэне і прымусілі верыць, што яны аднадумцы. Прымусілі сваёй ігрой: ігралі яны шчыра і самааддана. Тэатр гэты малады, на той час яму не было і дзясятка гадоў. Ён быў створаны на базе выпускнога курса Царскасельскага філіяла Пецярбургскай дзяржаўнай акадэміі тэатральнага мастацтва. Але нягледзечы на ўзрост, артысты паспелі атрымаць шмат тэатральных прэмій па выніках міжнародных фестываляў. Вядома, гэта сучасны тэатр, з навамодных. Але нешта сапраўднае, несумненна, у ім ёсць. Жывая іскрынка душы.

Не ўсе, мабыць, прынялі своеасаблівае прачытанне п'есы Горкага. Горкаўскія героі на сцэне не проста сталі сучаснымі. Яны ўяўляюць сабой не толькі дно жыцця, яны — арганічная частка чалавецтва. Гэтыя людзі толькі лахманамі і адрозніваюцца ад прадстаўнікоў сярэдніх слаёў ды вышэйшага свету. Праблемы, што хвалююць жыхароў бруднай начлежкі, аднолькава актуальныя для ўсіх членаў грамадства. Несімпатычны (паводле п'есы) горкаўскі Клешч тут выглядае проста няўдачнікам, але з душой і сэрцам. Ён вельмі старанна даглядае хворую жонку. Дурнаватая ў горкаўскім творы гандлярка Квашня ў спектаклі паўстае няшчаснай жанчынай, якая ўсё ж верыць у нейкае далёкае прывіднае каханне, што павінна прыехаць хуткім цягніком.

Да гэтай пары помніцца, як артысты рэальна пэцкаліся брудам, абліваліся вадой, пахлёбкай, апельсінавым сокам, — нават даставалася і гледачам у першых радах. Але выглядала ўсё натуральна і праўдзіва, таму і ўзнікаў давер. А яшчэ выканаўцы любілі сваіх герояў і змаглі перадаць долю сімпатыі гледачам. Міжволі пачынаеш спачуваць тым, хто ў гэтых непрыгодных для жыцця трушчобах, з якіх, па сутнасці, няма выйсця, можа падтрымліваць у сабе веру ў нейкае святло. Татаркакарліца, гераіня, якой няма ў п'есе, увесь час расказвае пра цудоўны, фантастычны горад Мекку — горад, дзе нікога не падзяляюць на багатых і бедных, на шчаслівых і няўдачнікаў, дзе ўсіх любяць проста так. Вось дзе сабака закопаны! Кожны адразу згадвае пра сваё, запаветнае. Мала хто, няхай сабе і падсвядома, не імкнецца ў горад, «дзе будуць любіць проста так». Нават калі той горад даводзіцца шукаць на карце іншай душы, там, дзе яго ніколі не было...

Колькі год таму Белгародскі дзяржаўны акадэмічны драматычны тэатр імя Шчэпкіна прывозіў «Гора ад розуму». Спектакль быў зроблены ў класічнай манеры, але вёў гледача за сабой ад першага да апошняга імгнення. І вось дзіва: не вядомы сюжэт Грыбаедава ўспамінаўся падчас дзеі, а тое, як мала ў нашым жыцці любові і разумення, як мала мы любім сваіх блізкіх, як наогул не ўмеем любіць. Вось вам і адказ пра горад, дзе будуць любіць проста так. Яго, відавочна, трэба будаваць, а не проста шукаць. Калі тэатр, класічны ці суперсучасны, прымушае разважаць аб гэтым, то для мяне гэта сапраўдны тэатр.

Святлана ЯСКЕВІЧ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

ЛОТ № 1: здание хлебопекарни общей площадью 523,8 кв.м (инв. № 602/С-22157); склад общей площадью 193,9 кв.м (инв. № 602/С-22153); склад, общей площадью 120,1 кв.м (инв. № 602/С-22154); конюшня, общей площадью 36,9 кв.м (инв. № 602/С-22155); склад общей площадью 43,7 кв.м (инв. № 602/С-22156) по адресу: **Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. П. Гучка, 8.**

Начальная цена с НДС – 900 000 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (90 000 000 бел. руб.);

ЛОТ № 2: здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин общей площадью 77,1 кв.м (инв. № 602/С-44082) по адресу: **Минская область, Пуховичский район, Дричинский с/с, д. Белое, 41.**

Начальная цена с НДС – 49 332 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (4 933 200 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.05.2012.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **10.09.2013 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 09.09.2013 до 12.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Молодечненский пищевой комбинат (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 62, в составе:

павильон для хранения стеклобанки,

инвентарный номер 630/С-4738 общей площадью 1895,3 кв.м, площадь земельного участка – **0,4913 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Начальная цена с НДС – 2 385 701 856 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (238 570 000 бел. руб) перечисляется на р/с № 3012108260016; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 18.01.2013.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **03.09.2013 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 02.09.2013 до 12.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

«ШКОЛЬНЫ СУПЕРМАРКЕТ» НА «БЕЛЭКСПА»

Для сталічнага гандлю трэцяя дэкада жніўня — традыцыйна самыя «гарачыя» дні, таму што многія сем'і, па традыцыі, адкладваюць паход па школьную экіпіроўку на апошнія дні летніх канікулаў.

